ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і Мастацтва

Год. выд. 33-і
№ 63 (1908)
жніўня 1964 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

7

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

## 9 ЖНІЎНЯ — ДЗЕНЬ БУДАЎНІКА

**Вось ідуць яны — спаважна, нетаропка... І прыгадваюцца словы паэта: «не магу цярпець я верхаглядаў, верхалазам — тысяча пашан». Гэта сказана і пра іх — Косцю Хаўханава, Івана Гарэлава, Станіслава Гладзіна, людзей «незямной» прафесіі — мантажнікаў, што сябруюць з небам, запальваюць зоркі, аздабляюць зямлю... А ўрэшце, гэта не толькі пра мантажнікаў, гэта — пра чалавека-стваральніка, чалавека-будаўніка.**

**Будаўнік... Прафесія, якой тысячы гадоў. А дакладна — столькі ж, колькі і чалавецтву. Самая старажытная прафесія. Напэўна, толькі хлебароб можа аспрэчваць яе старажытнасць. І з такім жа правам можна сказаць, што гэтая прафесія і самая маладая. І яшчэ — мірная.**

**Турысты з-за мяжы, прыязджаючы да нас, не абмінуць адзначыць хуткія тэмпы будаўніцтва ў нашай краіне. Іх, прадстаўнікоў іншага свету, гэта здзіўляе. На іх радзіме ўладальнікам палацаў і добраўпарадкаваных асабнякоў няма патрэбы будавацца, а тое, што хтосьці жыве на вуліцы, не маючы над сабой даху, багатых не турбуе.**

**Кожны год мільёны людзей у нашай краіне пераселяюцца ў новыя кватэры, паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы. Новыя жылыя кварталы, так званыя мікрараёны, выраслі ў Мінску, Гомелі, Магілёве і іншых гарадах рэспублікі. На карце Беларусі ў апошнія гады з'явіліся новыя назвы: Светлагорск, Салігорск, Наваполацк. Усё гэта — адрасы новых будоўляў. Гарады нараджаюцца там, дзе вырастае прамысловы гігант — завод, фабрыка, камбінат. Яны нараджаюцца, і пра гэтае нараджэнне можна пачуць шмат прыгожых легенд. Бо будаўнік — гэта яшчэ і самая рамантычная прафесія.**

**Хлопцы-мантажнікі Хаўханаў, Гарэлаў і Гладзін з будучага Гомельскага суперфасфатнага таксама пацвердзяць гэта.**

**Фота А. АНДРЫЕНКІ.**

## Літаратурная хроніка

### ЖН.ВЕНЬ — МЕСЯЦ

### УРАДЖАЙНЫ

«Час сеяць і час здымаць ураджай...» Відаць, жнівень у гэтым сэнсе — пара ўборкі не толькі для хлебаробаў.

— Цяжка ўстанавіць тут нейкую заканамернасць, — гаворыць загадчык рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь» А. Бажко, — але жнівень для нас сапраўды самы ўраджайны ў годзе. Мяркуйце самі. Толькі што выйшлі зборнік апавяданняў П. Пестрака «Сярод чаротаў» і зборнік Б. Сачанкі «Зямля маіх продкаў», а паступілі ўжо сігнальныя экземпляры кніг М. Грыцана «Асаблівы выпадак» і М. Кругавых «Не дзеля славы». На «падыходзе» раман Ул. Карпава «Нямігі крывавыя берагі» ў перакладзе на рускую мову М. Гарбачова і «Сустрэчы на ростанях» А. Кулакоўскага ў перакладзе на рускую мову Я. Мазалькова. Абедзве кнігі выйдуць тыражом у 100 тысяч экземпляраў.

Добрыя водгукі атрымала наша выданне «Гамлета» ў перакладзе Ю. Гаўрука з ілюстрацыямі Б. Заборава. А цяпер мы рыхтуем такое ж выданне «Санетаў» Шэкспіра. Гэта плён шматгадовай працы Ул. Дубоўкі. Б. Заборай зрабіў для кніжкі цікавыя ілюстрацыі.

«Пуцёўку ў жыццё» атрымае ў жніўні таксама дакументальная аповесць журналіста Р. Меня «Гісторыя аднаго подзвігу», прысвечаная выдатнаму сыну беларускага народа Аляксандру Гараўцу.

На сталах рэдактараў ляжаць зараз карэктурныя адбіткі зборнікаў М. Калачынскага «Гронка рабіны», К. Кірэенкі «Жывыя ідуць наперад», манаграфіі А. Сабалеўскага пра народнага артыста СССР Б. Платонава. Прыслаў з Лепеля аўтарскую карэктуру сваіх партызанскіх запісак «Ой, бярозы ды сосны» настаўнік М. Беркутаў.

Аматарам паэзіі, відаць, цікава будзе даведацца, што ў жніўні выйдзе новы зборнік П. Макаля «Круглы стол». І пра апошнюю кнігу жнівеньскага плана. Мы выдаём «Эцюды аб прозе» Ф. Куляшова. Кніга прысвечана творчасці П. Пестрака, І. Мележа, І. Навуменкі, Я. Брыля. Думаем, што яна зацікавіць студэнтаў, настаўнікаў, шырокія колы чытачоў.

Вось такі наш жнівень.

**П. РАЦЬКО.**

### У МАСКОЎСКІХ

### ВЫДАВЕЦТВАХ

**З кожным годам расце цікавасць рускага чытача да кніг пісьменнікаў Беларусі. Маскоўскія выдавецтвы штогод вялікімі тыражамі друкуюць творы празаікаў і паэтаў нашай рэспублікі. Некалькі кніг выдадзена і ў апошні час. «Роман-газета» надрукавала раман «Сэрца на далоні» І. Шамякіна. У «Советском писателе» выйшлі з друку зборнік вершаў «Хлеб мой надзённы» М. Танка і «Белазёрскі дзённік» Ул. Дадзіёмава. Выдавецтва «Молодая гвардия» выпусціла кнігу «Сустрэчы на ростанях» А. Кулакоўскага і зборнік вершаў «Галасы адлегласцей» Г. Бураўкіна.**

### ПА ЗАПРАШЭННЮ

### ВОІНАЎ

Аповесць Васіля Быкава «Трэцяя ракета» — адзін з любімых твораў салдат і сяржантаў Н-скай часці Беларускай ваеннай акругі. Воіны з цікавасцю прагледзелі кінафільм, створаны па аповесці. Салдаты і сяржанты даведаліся пра тое, што пісьменнік напісаў новую аповесць «Альпійская балада». Яны вырашылі запрасіць В. Быкава да сябе ў госці. І вось у салдацкім клубе адбылася сустрэча. Пісьменнік расказаў пра развіццё беларускай і рускай літаратур, пра новыя творы маладых празаікаў і паэтаў, адказаў на шматлікія пытанні.

У другую Н-скую часць быў запрошаны пісьменнік А. Карпюк. Ён прачытаў урывак з новага твора і пажадаў салдатам і сяржантам поспехаў у баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

**А. СЦЯПАНАВА.**

### МАСТАКІ Ў КЛУБЕ

### ПІСЬМЕННІКАЎ

*Мастакоў Мінска глыбока цікавіць гісторыя Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі і адлюстраванне яе ў мастацкай літаратуры. Яны сабраліся ў клубе Саюза пісьменнікаў. Пра тое, як планавалася аперацыя па вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў расказаў генерал-маёр у адстаўцы пісьменнік М. Аляксееў. Спыніўся ён таксама і на творах, прысвечаных гераічнай барацьбе савецкіх людзей з ворагам.*

**А. МІНЬКО.**

### АБ ДРУЖБЕ, АБ

### РОДНЫМ КРАІ

Больш 500 навагрудчан прыйшло гэтымі днямі ў Дом культуры. Тут адбыўся цікавы літаратурны вечар. У госці да жыхароў горада прыехалі пісьменнікі С. Яўсеева, Л. Арабей, А. Вольскі і мастак студыі «Беларусьфільм» Я. Ганкін.

Пісьменнікі гаварылі аб сваёй паездцы па месцах, звязаных з жыццём А. Міцкевіча, аб наведанні Дома-музея паэта ў Навагрудку, аб сустрэчах з калгаснікамі раёна.

Затым С. Яўсеева прачытала вершы «Фестываль», «Зямное прыцягненне», «Рыбачкі», прысвечаныя дружбе народаў. З увагай было выслухана невялікае апавяданне Л. Арабей «Стары буфет».

Аб нашым беларускім краі, аб цудоўных савецкіх людзях напісаў новыя вершы А. Вольскі. Свае творы паэт прачытаў на вечары.

## НА ЭКРАНЕ ФЕСТЫВАЛЮ — «МАСКВА—ГЕНУЯ»

Прагляд лепшых твораў савецкага кіно, выпушчаных за апошнія два гады, працягваецца. Кожны дзень фестывалю прыносіць новыя сустрэчы. Апроч цэнтральных студый у спаборніцтва ўступілі ўсе рэспубліканскія.

Днямі адбылася прэс-канферэнцыя. Кіраўнік беларускай дэлегацыі на Ленінградскім фестывалі, дырэктар «Беларусьфільма» І. Дорскі сказаў:

— З Ленінградам звязана нараджэнне нацыянальнага беларускага кінамастацтва. Амаль сорак гадоў назад ленінградцы аказалі вялікую дапамогу толькі што створанай арганізацыі «Белдзяржкіно». Яны па-братэрску падзяліліся небагатай у той час кінаапаратурай, прадаставілі ў наша распараджэнне памяшканне, прыстасаванае для здымак. Многія майстры кіно Ленінграда памагалі нам рабіць першыя крокі.

Яшчэ 2 жніўня, да прагляду фільма «Масква—Генуя» членамі журы, у кінатэатры «Вясна» адбылася першая дэманстрацыя стужкі. Гэты кінатэатр размешчан у адным з новых прамысловых раёнаў горада. Вялікая глядзельная зала не магла змясціць усіх жадаючых. Ужо ў час прагляду адчувалася, што гледачам фільм падабаецца. Пасля заканчэння дэманстрацыі раздаліся апладысменты. Да членаў нашай дэлегацыі падыходзілі гледачы і дзякавалі за добры фільм. Былі ў зале і беларусы, якія цяпер жывуць у горадзе Леніна. Яны гаварылі, што радуюцца дасягненням беларускага кінамастацтва.

Да аўтараў фільма А. Спешнева і А. Булінскага падышла старая камуністка тав. Ягорава. Яна была асабіста знаёмая з членамі савецкай дэлегацыі, якія ездзілі на канферэнцыю ў Геную, і добра памятае тыя суровыя гады. Таварыш Ягорава сказала, што фільм вельмі праўдзівы, падзеі паказаны дакладна, улоўлена атмасфера эпохі.

З жніўня быў Дзень Беларусі на фестывалі. У ленінградскім Доме кіно адбыўся паказ нашага фільма «Масква—Генуя». Удзельнікі прагляду шчыра апладзіравалі, віншавалі нашу дэлегацыю з поспехам.

Вялікую ўвагу фільму «Масква—Генуя» аддаюць ленінградскае радыё, тэлебачанне, друк. Так, газета «Экран фестывалю», орган прэс-бюро Усесаюзнага кінафестывалю, піша: «Нямнога назавеш сярод кінатвораў апошніх год фільмаў, у якіх бы так арганічна спляліся строгая дакументальнасць і паэтычнасць, утвараючы трывалы маналіт сапраўднага мастацтва, як кінааповесць «Масква—Генуя», створаная на кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтары карціны здолелі перакласці на мову мастацтва складаныя, вельмі сур'ёзныя пытанні сусветнай палітыкі і міжнародных адносін.

... Стылістыка карціны вельмі своеасаблівая і ў многім новая. Пастаноўшчык не баіцца рэзкіх пераходаў, імклівага мантажу, змены не толькі месца дзеяння, у якім жывуць і змагаюцца героі, але і персанажаў.

...Пераканаўча малююць стваральнікі фільма атмасферу міжнароднага жыцця тых гадоў. Яны здолелі паказаць дынаміку палітычнай думкі, вострае сутыкненне поглядаў, напружаную барацьбу, якую вялі савецкія дыпламаты за прызнанне Савецкай Расіі».

Газета «Ленінградская правда» піша ў рэцэнзіі «Зброяй слова, зброяй логікі»: «З неаслабнай увагай глядзяцца эпізоды, якія ўзнаўляюць абстаноўку тых гістарычных дзён, калі пачалося ленінскае змаганне за мір, якое нашы дыпламаты паспяхова вядуць і сёння. Рэальна-гістарычныя эпізоды пастаўлены і зняты гэтак жа, як і ў дакументальным фільме: лаканічна, напружана, выразна».

«Ленінградская правда» лічыць, што ў фільме менш удалая другая яго лінія — лірычная.

У некалькіх кінатэатрах Ленінграда разам з іншымі конкурснымі фільмамі фестывалю дэманструецца і кінастужка «Масква—Генуя».

У кінатэатры «Веды» былі паказаны нашы кароткаметражныя фільмы «Георгій Скарына», «Каларадскі жук», «Урок даўжынёю ў год».

Кожны дзень адбываюцца сустрэчы беларускай дэлегацыі з гледачамі. Яна пабывала ўжо ў саўгасе «Дзецкасельскі», у Доме культуры імя Капранава. Цяпер дэлегацыя запрошана на крэйсер «Кіраў», на якім былі зняты некаторыя кадры фільма.

Фестываль працягваецца.

**Р. ЯСІНСКІ,**
**спец. кар.**
**«Літаратуры і мастацтва».**

## РАЗМОВА АБ ЗАЎТРАШНІХ СТУЖКАХ

**Першы Усесаюзны кінафестываль, які адкрыўся ў Ленінградзе, працягвае сваю работу. Яго ўдзельнікі—200 вядучых савецкіх майстроў—сустракаюцца з гледачамі, расказваюць ім пра свае планы, выслухоўваюць крытычныя заўвагі. Карэспандэнт АДН папрасіў расказаць аб новых задумах некаторых кінематаграфістаў, чые фільмы былі сёлета цёпла прыняты гледачамі.**

Голас за кадрам носіць розныя функцыі—дыктарскі тэкст у дакументальным кіно, унутраны голас героя або аўтарскі каментарый—у мастацкім. Голас за кадрам прысутнічае і ў конкурсных фільмах. Але ў фанаграме фестывалю зусім не на другім плане і голас перад кадрам —дыялогі людзей, якія робяць фільмы.

Дыскусій з дакладна азаглаўленай тэмай не абгаворвалася. Усе размовы—імправізацыя: пытанні і адказы на сустрэчах з гледачамі, у кулуарах.

Сцэнарыст Генадзь Шпалікаў, аўтар конкурснага фільма «Я крочу па Маскве», дакладны ў адказах. Планы яго пэўныя. У бліжэйшы час ён пачынае на «Ленфільме» пастаноўку карціны па сваім сцэнарыі «Доўгае шчаслівае жыццё». Рэжысёрскі сцэнарый гатоў. Работа над фільмам, зойме ўвесь год. А на другой студыі—«Мосфільме»—прыняты да пастаноўкі яго сцэнарый «Дзень прывабнага чалавека». Рэжысёр Аляксандр Міта. Але ўся ўвага Г. Шпалікава засяроджана на доўгачаканым рэжысёрскім дэбюце.

— Фільм заўсёды патрабуе індывідуальнага вырашэння. Бывае шанцуе — дасягнеш супадзення ў поглядах з рэжысёрам, — гаворыць ён. — У мяне так было з Георгіем Данелія. Я многаму навучыўся ў яго і ў Марлена Хуціева. Але працаваць над сваім фільмам хачу інакш. Сцэнарыст з усім павінен спраўляцца сам. На мой погляд, гэта патрабаванне сучаснага кіно—самы правільны шлях ад адзінства задумы да адзінства ўвасаблення.

Знойдзенае ў карціне «Я крочу па Маскве» развіваць не збіраюся. Не хацелася б і «двайнікоў», «братоў» фільма. У мастацтве не патрэбны паўтарэнні.

Па сцэнарыі Мераба Эліязішвілі знят фільм «Белы караван», прадстаўлены на фестываль Грузіяй. Сцэнарыст з бляскам іграе ў ім эпізадычную ролю шафёра.

— Ці буду я яшчэ здымацца? У новым сцэнарыі «Вялікі зялёны луг» ёсць для мяне роля маладога пастуха. Я ж сам пасвіў кароў. Сыграць вельмі хочацца. Думаю і аб самастойнай рэжысуры, хоць і няёмка прасіць пастаноўку—цяпер у нас шмат таленавітых маладых рэжысёраў. У апошні час рэжысёр часта становіцца сааўтарам сцэнарыста. Час паспрабаваць і наадварот. Быць нейтральным у час здымкаў сцэнарысту ніяк нельга. Вопыт Генадзя Шпалікава пераконвае, якая карысная сумесная творчасць. Хоць, шчыра кажучы, з манерай, у якой зроблена карціна «Я крочу па Маскве», згодзен не ва ўсім. Лёгкасць, паветранасць у почырку—гэта не мае.

— Мая тэма? Вось сфармулявць цяжка. У мяне бацька—аграном з саракагадовым стажам. Мы з ім шмат спрачаемся. І спрэчкі пераходзяць у многія мае работы. Я спрабую разабрацца ў прычынах спрэчкі. Адносіны пакаленняў—магчыма, так варта назваць маю тэму. Я пішу пра знітаванасць спраў бацькоў і дзяцей, іх узаемаўзбагачэнне ў працы, спрэчках...

Прызнаюся, я пераказаў думкі Г. Шпалікава і М. Эліязішвілі ражысёру Яўгенію Ташкову, які суправаджае на фестывалі сваю камедыю «Прыходзьце заўтра» (дарэчы, ён і адзін з аўтараў сцэнарыя), знятую на Адэскай студыі. Я. Ташкоў другога кінематаграфічнага «берагу», чым Г. Шпалікаў і М. Эліязішвілі. Выпускнік акцёрскага факультэта Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі, які пяць гадоў працаваў артыстам і рэжысёрам у Тэатры кінаакцёра, здымаўся ў фільме «Капітан «Старой чарапахі», ён прайшоў шлях да рэжысёрскага месца, па яго словах, «ад цвіка да рэжысёра сцэнарыя».

— Што ж, забараніць сцэнарыстам прабаваць сябе ў рэжысуры нельга. Хоць некаторыя і ў сваёй якраз сцэнарнай галіне паказваюць няведанне самых азбучных ісцін кіно. Пішуць, напрыклад: «вёслы бяссільна ўпалі на ваду». Што значыць «бяссільна»? Як гэта здымаць? Або—«вуліца, вымытая дажджом». Як быццам невядома, што вуліцу для падобнай здымкі палівае пажарная машына. Магчыма, гэта—паэзія? Не. У кіно свае паэтычныя вобразы, свой арсенал слоў. Толькі яго не заўсёды ведаюць сцэнарыстыі бяруць з «іншай сірынкі». А ў акцёрскай «шкуры» сцэнарысту, калі ён ужо так марыць ад рэжысуры, варта пабываць. Я быў акцёрам і акцёрская кроў ва мне да гэтага часу не згасла. Аднак мая «смага»—папярэдні фільм — работа, пастаўленая без акцёрскіх выбухаў. Я за акцёрскі кінематограф. Толькі ў ім па-сапраўднаму бачыш рухі чалавечай душы. Прыкладам такога кінематографа я лічу фільм Васіля Шукшына «Жыве такі хлопец». Выдатна іграе Кураўлёў. І не страшна, што метражу не хапае для іншых персанажаў. Мне імпануюць і тыя акцёры, якія простыя праўдзівасцю. Не пункт гледжання прахожага, які бачыць паток жыцця, вызначае мастака. Мне хочацца канкрэтнага адкрыцця. Я баюся страшнага для мастацтва слова «нагул».

Тры кароткія гутаркі. Тры розныя галасы перад кадрам. Гэта галасы людзей, якія прыхуюцца заўтра сказаць з экрана новае.

Галасы заўтрашніх стужак...

**Аляксандр НІЛІН,**
**спецыяльны карэспандэнт АДН.**
г. Ленінград.

## Нашы інтэрвію

## ВОЛАТУ ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ

**Адно з буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі — Мінскі аўтамабільны завод святкуе свой дваццацігадовы юбілей.**

**— Раскажыце пра самае цікавае, самае важнае ў жыцці вашага калектыву за дваццаць гадоў, — папрасіў карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» інжынера М. Кудэнку, культасветработніка Ф. Цішкаўца, рабочага К. Гляйхенгауса.**

**Для расказу аб родным заводзе ў кожнага знайшлася свая тэма, сваё ўсхваляванае слова.**

### Міхаіл КУДЭНКА —
**інжынер, старшыня камісіі па напісанню гісторыі завода**

Гісторыі Мінскага аўтамабільнага, як гэта відаць па маёй грамадскай пасадзе, яшчэ няма. І ў той жа час яна існуе—у дзесятках дакументаў, у легендах, у песнях. Колькі цікавых старонак у нашай будучай кнігі! Вось адна з іх.

Калі ішла зборка першых МАЗаў, у старшыні заводскага камітэта Яфіма Даніяха нарадзілася дачка. Рабочыя жартам прозвалі яе «зубранём».

Дзе яна цяпер, равесніца нашых першынцаў?

Здымаю трубку і званю ў інструментальна-штамповачны, дзе працуе маці «зубраняці».

— Усё ў парадку, Міхаіл Мікалаевіч, — кажа яна. — Света заканчвае аўтамеханічны тэхнікум, праходзіць зараз практыку ў нас на заводзе, працуе на капіравальна-фрэзерным...

Дзе ж ёй яшчэ быць, сястрыцы нашых волатаў!

Света нарадзілася разам з самазваламі, а для многіх такім днём нараджэння стаў прыход на завод.

Аб гэтым добра магла б расказаць Герой Сацыялістычнай Працы Надзея Якубовіч, ціхая дзяўчынка з палескай вёскі, цяпер праслаўлены наватар, брыгадзір шпянькоўшчыц.

Можна было даць слова начальніку штампавальна-інструментальнай гаспадаркі сталёвага цэха № 1 Аляксандру Панкаўцу. На завод ён трапіў пятнаццацігадовым хлапчуком. Дваццацігоддзе аўтамабільнага ён адзначае ўкараненнем 29 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія штогод даюць каля 40 тысяч рублёў эканоміі.

Наш завод праславіўся як своеасаблівая кузня кадраў для машынабудаўнічай прамысловасці ўсёй рэспублікі.

Слесар Іван Сідаровіч у нас канчаў вячэрнюю школу і інстытут. Зараз ён дырэктар БелАЗа. Слесар з аўтазавода Іван Скаварадзін зараз узначальвае Мінскі аўтарамонтны завод.

Нашы выхаванцы—дырэктар Мінскага завода ацяпляльнага абсталявання А. Сафронаў, дырэктар мінскага завода «Ударнік» П. Янус, дырэктар Мінскага завода электрахаладзільнікаў В. Воранаў. Аўтазаводцаў вы сустрэнеце і ў Гродна, і ў Магілёве, і на многіх іншых прадпрыемствах Беларусі.

Найбольш прыкметна відаць рост кадраў на самім заводзе. Амаль усе нашы начальнікі цэхаў, аддзелаў і іх намеснікі прайшлі шлях ад радавых рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў да камандзіраў вытворчасці.

За 20 гадоў у нас склаліся свае рабочыя дынастыі. Я раскажу толькі пра адну такую сям'ю. Гаспадар яе — Сяргей Аляксандравіч Трубкін вось ужо 20 гадоў працуе на заводзе ліцейшчыкам. Сын Сяргея Аляксандравіча Аляксей узначальвае брыгаду слесараў у цепласілавым цэху, сын Анатоль — брыгаду зборшчыкаў на галоўным канвееры. Слесарам на ЦЭЦ працуе Віктар Трубкін, бухгалтарам у мадэльным цэху — Валянціна, разам з бацькам у адным цэху кранаўшчыца Зіна, а ў эксперыментальным вы сустрэнеце малодшага Трубкіна — Уладзіміра.

Такія сем'і — гордасць нашага рабочага калектыву, яго слава.

Дзяржава шмат чаго зрабіла для дабрабыту аўтазаводцаў. За 18 гадоў уведзена ў строй 137.244 квадратных метраў жылой плошчы. Толькі за апошнія гады ў санаторыях і дамах адпачынку пабывала 6.539 рабочых. Вельмі характэрныя лічбы, якія паказваюць рост культуры, імкненне рабочых да адукацыі. У агульнаазводскай бібліятэцы — 58 тысяч кніг, яна мае два філіялы і 25 перасовак. На тэрыторыі завода працуюць шэсць агульна-адукацыйных і дзве пазменныя школы рабочай моладзі, адкрыты філіял вячэрняга політэхнічнага інстытута (цяпер гэта агульнатэхнічны факультэт БПІ), аўтамеханічны тэхнікум, трохгадовая школа майстроў, прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча. Без адрыву ад вытворчасці закончыла ў нас сярэднія школы 1 401 чалавек, тэхнікумы — 796 і ВНУ — 373 чалавекі. Цяпер у ВНУ і тэхнікумах вучацца 843 рабочых.

...Я ў думках перагартаў толькі некалькі старонак нашай заводскай гісторыі. Яна і незвычайная і звычайная, і поўная цудаў і простая — такая, як наша савецкае жыццё.

### Фёдар ЦІШКАВЕЦ,
**старшыня праўлення Дома культуры.**

Ад галоўнай заводскай прахадной да Магілёўскай шашы пралягла вуліца, якая называецца Працоўнай. Гэта наш другі галоўны праспект. Тысячы людзей ідуць па ёй — з дня ў дзень, з ночы ў ноч—на змену і са змены. Працоўнай вуліцы прысвечана песня, якую ў дні юбілею выканае заводскі хор. 55 рабочых, аматараў народнага спявання, аб'яднаў гэты калектыў. Кіруе ім Аляксандра Пятроўна Нікіціна. Яна аўтар «Працоўнай вуліцы» і яшчэ адной песні пра Мінскі аўтазавод — «Нашы МАЗы бягуць».

Слава завода — у яго машынах. А машыны гэтыя робяць людзі з цудоўнымі душамі. Спытайцеся ў тых, хто выходзіць з заводскай прахадной і па-гаспадарску крочыць Працоўнай вуліцай. Вы даведаецеся, што кожны трэці з іх абавязкова вучыцца, а кожны пяты — яшчэ і артыст.

На аўтазаводзе ганарацца майстрам цэху Рыгорам Яфімавым, слесарам Уладзімірам Страшынскім, канструктарам Людай Галавань, планавіком Верай Мярзлюк. Яны — не толькі выдатныя работнікі, але і вядомыя аматары самадзейнасці, выканаўцы, майстэрства якіх, можна сказаць, знаходзіцца на прафесіянальным узроўні.

Не магу не прыпомніць тут кур'ёзны выпадак. Журы аднаго з конкурсаў адмовілася прысуджаць першае месца нашаму дзіцячаму баяннаму аркестру на той падставе, што выкананне яго знаходзіцца не на «самадзейным узроўні». Членам журы здавалася, што аркестр складаецца не інакш як з навучэнцаў музычных вучылішчаў. Давялося дакументальна пераконваць іх.

Нядаўна народны тэатр нашага завода гастраліраваў у Мядзельскім раёне. Мясцовая газета пісала потым, што калектыў, на думку гледачоў, не горшы за прафесіянальны. У Мядзелі мы паказвалі «Даходнае месца» і «Выбачайце, калі ласка». А ў рэпертуары тэатра яшчэ такія складаныя п'есы, як «Ягор Булычоў і іншыя», «Разлом». Зараз ідуць рэпетыцыі «Любові Яравой».

Калектыў нашага народнага тэатра выступаў на сцэне Крамлёўскага тэатра ў Маскве, атрымаў першую прэмію на конкурсе самадзейных тэатральных калектываў краіны.

Больш пяцідзесяці чалавек у заводскім аркестры народных інструментаў. Яму таксама прысвоена званне «Народны».

Можна шмат расказваць пра самадзейныя калектывы аўтазаводцаў, але я спынюся яшчэ толькі на мужчынскім хоры інтэрната № 1. Гэта яму кампазітар Алоўнікаў даверыў першае выкананне многіх сваіх песень. У нас упершыню прагучалі і «Брэсцкая крэпасць», і «Аршанская старонка», і «Песня аб юнацтве».

Толькі буйных выканаўчых калектываў на заводзе семнаццаць...

Нехта жартам прапанаваў да зубра на нашай заводскай эмблеме дадаць ліру. Што ж, не такое гэта ўжо нечаканае спалучэнне. Ва ўсякім разе заводская самадзейнасць славы беларускаму асілку не адбавіла.

### Казімір ГЛЯЙХЕНГАУС,
**ліцейшчык, кіраўнік літаратурнага аб'яднання**

Літаб'яднанне на заводзе... Гэта стала ўжо нейкай адметнай рысай рабочага жыцця. Першы самазвал з варот Мінскага аўтамабільнага выйшаў у 1947 годзе. І ў тым жа годзе на заводзе ўзнік літаратурны гурток.

«Апантаных словам» цяпер нямала сярод аўтамабілебудаўнікоў. Раскажу пра некаторых сваіх сяброў.

Вось ужо дзесяць год наведвае літаратурнае аб'яднанне электрык Алег Ранкоўскі. Яго вершы друкаваліся ў «Труде», у маладзёжных газетах, перадаваліся па радыё. Алег працуе цяпер на маторным заводзе, але па-ранейшаму ходзіць на нашы «літаратурныя серады».

Вершы Хведара Чэрні шматтыражка панала друкаваць яшчэ тады, калі ён вучыўся ў тэхнічным вучылішчы пры заводзе. Потым хлопца прызвалі ў армію. Ён і адтуль прысылаў нам свае новыя вершы. Цяпер Хведар — студэнт універсітэта. У выдавецтве «Беларусь» рыхтуецца яго першы паэтычны зборнік.

Побач са мною ў цэху коўкага чыгуну працуе Леў Раманаў. Раманаў славіцца як ліцейшчык, у літаб'яднанні ён — прадстаўнік крытычнай думкі, а навучэнцам школы дарослых вядомы яшчэ і як выкладчык. Леў скончыў завочна універсітэт, але цэх не пакінуў. Ён цяпер і рабочы і выкладчык.

Летась паступіў на аддзяленне журналістыкі універсітэта член нашага літаб'яднання Васіль Цішкоў. Васіль працаваў слесарам, цяпер ён механік цэха. Нядаўна нарыс В. Цішкова надрукавала «Советская Белоруссия».

Не ведаю, як наконт пуцёвак у літаратуру, а вось пуцёўкі ў журналістыку наша літаб'яднанне дало ўжо многім.

Факультэт журналістыкі універсітэта закончыла піраметрыстка кавальскага цэха Ірына Кавалеўская. Журналістам стане і наша выхаванка Галіна Грыгаровіч. А зусім нядаўна папрасіў рэкамендацыю ва універсітэт фармоўшчык Уладзімір Дарашэвіч. Уладзімір толькі пачынае свой працоўны шлях, а вось у канструктара Героя Савецкага Саюза Яўсея Вайнруба за плячыма, як кажуць, ужо цэлае жыццё. Я. Вайнруб, член літаб'яднання, піша кнігу пра таварышаў па вайне — «Людзі ў бранi».

Давялося прыняць удзел у барацьбе з ворагам і мне. Сябрам па зброі прысвечаны многія мае вершы. Некаторыя з іх пакладзены на музыку, у тым ліку песня пра ветэранаў завода, песня пра наш родны Заводскі раён.

Мы рыхтуем да выпуску пяты зборнік вершаў, апавяданняў і нарысаў членаў літаб'яднання, заводскія літаратары пішуць кінасцэнарый і п'есу на матэрыяле рабочага жыцця.

Я хацеў бы, карыстаючыся выпадкам, падзякаваць нашым шэфам — пісьменнікам Мікалаю Гарулёву і Рыгору Бярозкіну. З іх дапамогай убачылі свет многія творы рабочых-аўтазаводцаў.

ЭНТУЗІЯСТЫ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

# ПРАЗ ЖЫЦЦЁ — З ПЕСНЯЙ

Гэта было ў пачатку ліпеня. Як заўсёды, увечары ў летнім тэатры Гомельскага парку культуры і адпачынку імя Луначарскага сабралася многа людзей. Канцэрт яшчэ не пачаўся, і гледачы гаманілі паміж сабой. Але вось праз усю пляцоўку да эстрады рушыла вялікая група моладзі, мужчын і жанчын у маляўнічых нацыянальных касцюмах. Многія з іх неслі ў руках чамаданы і мелі выгляд людзей, што сабраліся ў далёкую дарогу.

— Зараз перад вамі, — аб'явіў канферансье, — выступіць Прыбыткаўскі народны хор пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры рэспублікі Фёдара Фёдаравіча Пятрэнкі. Праз некалькі гадзін гэты калектыў выязджае ў Маскву, на Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі, дзе дасць канцэрт для працоўных сталіцы і яе гасцей.

Калі самадзейны калектыў закончыў выступленне, доўга не сціхалі апладысменты гледачоў — даніна павагі і падзякі.

Адкуль жа пачалася дарога,

Ф. ПЯТРЭНКА.

якая прывяла ўдзельнікаў самадзейнасці далёкай беларускай вёскі ў сталіцу нашай Радзімы — Маскву?

...Гэта было 33 гады назад. У Прыбыткаўск у ю пачатковую школу прыехаў малады настаўнік Фёдар Пятрэнка. Як і іншыя педагогі, працаваў ён старанна, з душою. Але яго вылучала з асяроддзя калег палымянае захапленне музыкай, вялікая любоў да непаўторнай у сваёй прыгажосці народнай песні. Малады настаўнік з вялікай цікавасцю слухаў песні, сам ахвотна спяваў разам з галасістымі хлопцамі і дзяўчатамі. Хутка ў яго ўзнікла думка аб'яднаць аматараў народнага мастацтва ў харавы калектыў.

Арганізацыя хору аказалася складанай справай. Не хапала нот, не было музычных інструментаў ды і сабрацца для рэпетыцый не было дзе. Юнакі і дзяўчаты, бойкія сярод сваіх сяброў, саромеліся спяваць у хоры. Але нездарма кажуць, што энтузіязм усё перамагае.

У 1934 годзе невялікі самадзейны калектыў пад кіраўніцтвам настаўніка Ф. Пятрэнкі выступіў з першым канцэртам. Хутка да Прыбыткаўскага хору далучыліся ўдзельнікі самадзейнасці з суседняй вёскі Дуянаўка.

Ішоў час. Ф. Пятрэнка самастойна авалодаў асновамі музычнай граматы, навучыўся іграць на мандаліне і іншых інструментах. Расло і майстэрства харыстаў.

У 1935 годзе хор прыняў удзел у раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці і заняў там першае месца. Праз год калектыў упершыню даў канцэрт у Мінску, перад удзельнікамі нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі. Пазней хор яшчэ двойчы выступаў у сталіцы рэспублікі.

Другая маладосць самадзейнага калектыву пачалася пасля Вялікай Айчыннай вайны. Склад удзельнікаў хору намнога змяніўся, але па-ранейшаму яго канцэрты любілі жыхары Прыбытак і навакольных вёсак, працаўнікі суседніх раёнаў і Гомеля. У 1962 годзе калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла калектыву званне Народнага хору. А яго нязменны кіраўнік Фёдар Пятрэнка ўдастоіўся ганаровага звання заслужанага дзеяча культуры рэспублікі.

У складзе праслаўленага хору цяпер каля 60 чалавек — людзей розных узростаў і прафесій, якіх аб'ядноўвае любоў да песні, што выхаваў у харыстаў Фёдар Фёдаравіч. Многія з іх — перадавікі вытворчасці. Вось некалькі прыкладаў. Марыя Сафронава, нядаўняя выпускніца сельскагаспадарчага тэхнікума, узначаліла брыгаду, якая сёння заслужана лічыцца лепшай у саўгасе «Гомельскі». Па ініцыятыве маладога агранома, важака камсамольскай арганізацыі саўгаса Івана Дамарада ў гаспадарцы настойліва ўкараняецца новае і перадавое. Паважаюць усе і трактарыста Віктара Кушнярова за яго спрыт і ўмельства. А Леанід Уласаў? Быццам непрыкметная ў хлопца прафесія — рабочы кузні. Але працуе — люба глядзець, а спявае — заслухаешся.

У народным хоры ўдзельнічаюць настаўнікі Зябраўскай сярэдняй і суседніх школ, служачыя, хатнія гаспадыні, работнікі культуры і вучні. Быць членам самадзейнага калектыву ў Прыбытках — вялікі гонар.

Умела падабраны рэпертуар і майстэрскае выкананне песень — таксама адметныя рысы Прыбыткаўскага народнага калектыву. Не любяць у хоры спяваць песні-«аднадзёнкі», творы, разлічаныя на танны поспех. Аснову праграмы любога канцэрта складаюць беларускія, рускія і ўкраінскія народныя песні, творы савецкіх кампазітараў. У рэпертуар уключана таксама музыка краін народнай дэмакратыі.

Характэрна, што многія рэчы выконваюцца ва ўласнай інтэрпрэтацыі кіраўніка хору. Фёдар Пятрэнка ўважліва прыслухоўваецца да таго, як гучыць тая ці іншая папулярная песня ў выкананні вядомага народнага хору або артыста, але не капіруе, не робіць рэч «пад кагосьці», а імкнецца надаць ёй сваё гучанне. Асабліва ўдала выконвае хор лірычныя песні.

Вядома, майстэрства выканання не прыходзіць само па сабе. Старанная творчая праца — вось аснова поспеху Фёдара Фёдаравіча і яго калектыву.

Мне давялося прысутнічаць на адной з рэпетыцый хору. Прызнацца, я быў крыху здзіўлены прафесіянальным узроўнем заняткаў з удзельнікамі самадзейнасці: падобнае сустрэнеш не так ужо часта. Харысты вывучаюць нотную грамату, займаюцца сальфеджыо.

— Каб песня добра гучала, — усміхаецца Пятрэнка, — трэба перш за ўсё правільна паставіць голас кожнага ўдзельніка хору і навучыць людзей асновам нотнай граматы. Да таго ж, цяпер у нашым калектыве многа новых удзельнікаў, пераважна моладзь, якую трэба вучыць.

Фёдар Фёдаравіч дастаў мандаліну. І, здаецца, цесна стала ў прасторнай зале сельскага клуба. Падхопленая дзесяткамі звонкіх галасоў, песня быццам вырвалася на прастор, птушкаю паляцела над шырокімі калгаснымі палеткамі.

Цудоўна спяваюць харысты! Шчыра, сардэчна і паэтычна... Слухаеш іх, і міжволі перад вачыма ўстаюць калгасныя палі з іх непаўторным водарам, фарбамі, гукамі. Многа трэба, каб Фёдар Фёдаравіч быў задаволены спяваннем. Тонкі знаўца музыкі, чалавек, аднолькава патрабавальны як да сябе, так і да іншых, Пятрэнка разам з харыстамі старанна адшліфоўвае кожны радок песні.

Позна ўвечары канчаецца рэпетыцыя. Але Ф. Пятрэнка разам з баяністам Іванам Галко яшчэ схіляюцца над нотамі, гартаюць рэпертуарныя зборнікі, — ім трэба знайсці некалькі новых нумароў для наступнага канцэрта.

Нядаўна грамадскасць Гомельскага раёна і вобласці ўрачыста адзначыла слаўны юбілей народнага хору — яго 30-годдзе. Віншаванне самадзейнага калектыву адбывалася ў клубе калгаса «Перамога» ў вёсцы Краснае. Бура апладысментаў узнялася ў зале, калі на сцэне выстраіліся ўдзельнікі народнага хору — юнакі, дзяўчаты і пажылыя хлебаробы. Пра кожнага з іх у той вечар было сказана шмат добрых слоў, кожнаму ўручаны граматы, букеты кветак.

* * *

Будучы нядаўна ў Прыбытках, я завітаў да Фёдара Фёдаравіча. Ён доўга і з захапленнем расказваў мне пра работу ў Зябраўскай сярэдняй школе, дзе ён працуе ў малодшых класах, пра былых вучняў, якія не забываюць свайго настаўніка, пішуць яму.

Паездка калектыву ў Маскву адбылася. Хор з гонарам вытрымаў экзамен на творчую сталасць. Удзельнікі і экскурсанты Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР цёпла сустрэлі яго выступленне. Спадабаўся канцэрт і рабочым маскоўскага інструментальнага завода «Калібр».

Нядаўна Фёдару Фёдаравічу споўнілася пяцьдзесят гадоў. Час пасеребрыў яго скроні, але ён па-ранейшаму энергічны і малады душою. У кіраўніка хору шмат творчых задум.

— Трэба папоўніць нашу праграму мясцовымі народнымі песнямі, — дзеліцца ён сваімі планамі. — Многія з іх хор выконваў яшчэ да вайны. Будзем гутарыць са старажыламі вёскі, запісваць старадаўнія і сучасныя мелодыі. Некаторыя рэчы будзем спяваць без музычнага суправаджэння: трэба нам шырэй прапагандаваць культуру акапэльнага спявання. Увогуле работы наперадзе шмат. Мы ідзём насустрач трэцяй Дэкадзе самадзейнага мастацтва. Будзем старацца, каб наш калектыў сустрэў гэтае свята народнага мастацтва новай цікавай праграмай. Над гэтым мы цяпер і будзем працаваць.

Ф. БРОДСКІ.

Гомельскі раён.

Харавы, танцавальны, аркестр духавых інструментаў, дзіцячыя драматычны і танцавальны калектывы працуюць пры Доме культуры будтрэста № 2 (Мінск). Танцавальны самадзейны калектыў аб'ядноўвае каля 30 чалавек. У рэпертуары калектыву — «Беларуская полька», «Лявоніха», руская, украінскія, малдаўскія, румынскія, венгерскія танцы. Зараз калектыў рыхтуецца да выступлення ў святочны Дзень будаўніка. На гэтым здымку вы бачыце ўдзельнікаў танцавальнага калектыву Галіну Чарнік, Уладзіслава Хрычова, Алену Аніфер і Рыгора Кляйко на рэпетыцыі.

Фота Ул. КРУКА.

## НАСУСТРАЧ ВЫСТАЎЦЫ «НА ВАРЦЕ МІРУ»

У наступным годзе спаўняецца дваццацігоддзе перамогі над фашысцкай Германіяй. У гонар гэтай знамянальнай даты ў Маскве будзе наладжана Усесаюзная мастацкая выстаўка «На варце міру». Ёй будуць папярэднічаць рэспубліканскія мастацкія выстаўкі, у тым ліку і ў Мінску.

На беларускай выстаўцы «На варце міру» несумненна знойдуць месца лепшыя з шырока вядомых твораў мастакоў нашай рэспублікі аб гераізме савецкіх воінаў і партызан, створаных у пасляваенны час: «Абарона Брэсцкай крэпасці» Я. Зайцава, «Мінск. 3 ліпеня 1944 года» В. Волкава, «Абаронцы Брэсцкай цытадэлі» І. Ахрэмчыка, «Партызаны ў разведцы» Я. Ціхановіча, «Чэсць абавязку» і «Партызаны» М. Савіцкага, графічная серыя аб партызанах «Рэйкавая вайна» С. Раманава, скульптурны партрэт Мікалая Гастэлы, створаны А. Бембелем, і іншыя.

Выстаўком Міністэрства культуры БССР зацвердзіў эскізы твораў на ваенную і абаронную тэмы і заключыў больш дваццаці дагавораў з мастакамі Мінска, Брэста і іншых гарадоў рэспублікі. Акрамя таго, больш сямідзесяці мастакоў розных профіляў працуюць над ваенна-патрыятычнай і абароннай тэмамі, каб прыняць удзел у выстаўцы «На варце міру».

Так, напрыклад, графік Л. Лейтман працуе над серыяй пейзажаў граніцы; графік А. Волкаў стварае акварэльныя лісты, прысвечаныя подзвігам партызан і мірным будням пагранічнікаў; жывапісец А. Вайнштэйн піша кампазіцыйны партрэт Героя Савецкага Саюза генерал-маёра Харламава; В. Грос працуе над скульптурнай групай «На прывале»; Я. Тарас заканчвае серыю плакатаў аб барацьбе за мір; А. Забораў завяршае палатно «Балтыйцы». Жывапісец Я. Зайцаў і скульптар С. Селіханаў таксама актыўна рыхтуюцца прыняць удзел у выстаўцы. Складаныя тэматычныя палотны ствараюць да выстаўкі Н. Воранаў, І. Ціханаў, Д. Алейнік.

Саюз мастакоў БССР часта накіроўвае мастакоў у творчыя камандзіроўкі ў воінскія часці. Асабліва часта выязджаюць да пагранічнікаў М. Тарасікаў, Л. Лейтман, П. Дурчын, І. Белановіч, В. Грос. Яны дапамагаюць пагранічнікам у афармленні наглядная агітацыйнай ленінскіх пакояў, кансультуюць самадзейных мастакоў-воінаў.

Сярод мерапрыемстваў, прысвечаных падрыхтоўцы да выстаўкі,— сустрэчы мастакоў з прадстаўнікамі Палітупраўлення Беларускай ваеннай акругі, пастаянная кансультацыя мастакоў у акруговым Доме афіцэраў.

Ул. САКАЛОЎ,
старшыня ваенна-шэфскай камісіі Саюза мастакоў БССР.

КІНО

# ЧАМУ НЕ ЎСМІХАЕЦЦА ЧАРАЎНІК

«Увага! У горадзе чараўнік!» І мы трапляем у горад, што зяе фарбамі вясёлкі. Вось-вось — і багацце святла, кветак, сонца створаць у нас адчуванне свята. Высокія будынкі, зялёныя праспекты і прыгожыя плошчы... Але дыктар папярэджвае: гэта не зусім звычайны горад. Ён казачны!

Горад хоць і казачны, ды ў ім таксама, як і ў звычайным горадзе, як і ў звычайным жыцці, побач са шчырымі і сумленнымі людзьмі жывуць і іншыя, у якіх сэрцы чэрствыя, як абаранкі ў кафэ кухара Пятра Пятровіча, а рукі ляныя. З усіх спосабаў барацьбы з імі аўтары выбіраюць самы казачны — у горад прыходзіць чараўнік. Ён ператварае ў лялек гультая-кухара, хлапчука-хулігана, безгаспадарлівага ўпраўляючага дамамі. Ім трэба палюбіць дзяцей і тады яны зноў вернуцца да жыцця...

Такі, у двух словах, змест новага фільма сцэнарыстаў В. Вітковіча, Г. Ягдфельда і рэжысёра Ул. Бычкова (Студыя «Беларусьфільм»). Гэта магла б быць добрая павучальная гісторыя, цікавы эксперымент у жанры камедыйнай эксцэнтрыкі...

Але тут хацелася б задаць аўтарам і рэжысёру пытанне, якое стаіць у вагалоўку нашай нататкі: чаму іх чараўнік ні разу не ўсміхнуўся? Ён жа юны і жыццялюбны. І справы яго самыя вясёлыя і дзівосныя. Нарэшце, ён не проста чараўнік, а чараўнік з казкі для дзяцей з камедыйнымі героямі, з камедыйным канфліктам, з камедыйнымі сітуацыямі — спачатку фільм так і называўся: «Лялечная камедыя».

Але героям не весела, і гледачам, калі сказаць шчыра, таксама. Нават самому чараўніку... І хочацца зразумець прычыны гэтай невясёлай гісторыі.

Фільм стварыў таленавіты калектыў. Мы памятаем разумную, лірычную і смешную навелу Ул. Бычкова «Тамбу-Ламбу», якую прызналі і палюбілі маленькія гледачы. Цікавым і смелым каляровым вырашэннем вызначалася работа аператара М. Кожына ў фільме «Хлопчык і голуб». Удала дэбютавалі ў мультыплікацыі маладыя мастакі В. Левенталь і А. Курыцын.

У лепшых эпізодах новай карціны таксама адчуваецца адзінства творчай задумы і стылю. Прыгадаем забаўную і дасціпную сцэнку, калі лялькі крадуць аўтамабіль гоўстага раўнадушнага доктара Кракса, каб хуценька прывезці хворай Таце чараўнічае лякарства «Кукарэкуін». Або эпізод кансіліуму лякарстваў. Тут мастакі і аператары дакладна ведаюць, чаго хоча ад іх рэжысёр, і знаходзяць яснае і выразнае вырашэнне.

Аднак такіх эпізодаў вельмі мала. Завелькі шмат эпізодаў туманных, блытаных. Фільм нават даросламу гледачу цяжка ўспрымаць, бо ў ім няма выразнай мэтанакіраванасці.

Аўтары, напэўна, хацелі стварыць героя не толькі камедыйнага, але і рамантычнага (чараўнік нездарма нагадвае то грынаўскага Грэя з «Алых парусоў», то Ціля Уленшпігеля). Але яны не здолелі ясна і проста данесці да гледача ідэі дабраты, радасці і непрымірымасці да зла, не здолелі знайсці дакладнае мастацкае вырашэнне сваіх задум.

У першым варыянце фільм прызначаўся для дарослай аўдыторыі. Але ўжо і тады не адчувалася ідэйнай і эмацыянальнай глыбіні, выразна відна была дробнасць, няяснасць драматургіі і характараў персанажаў. Пры перапрацоўцы карціны для маленькага гледача гэтыя недахопы не зніклі, а яшчэ больш выпукліліся. Сто тысяч «чаму» ўзнікаюць адносна кожнага эпізода. Цяжка прасачыць за логікай дзеяння і развіццём характараў герояў. Чаму безгаспадарлівы Майстар шчотак для ботаў і рассеяны Гадзіннікавых спраў майстар засталіся непакараныя? Чаму так паспешліва, нечакана для глядача ператварыліся ў добрых людзей гультай-кухар і хуліган Васька? Чаму Аптэкар, па задуме нібы і падобны на доктара Айбаліта, не выклікае сімпатыі?

Зацік смех залы ўжо ў першыя мінуты прагляду; выцвілі яркія фарбы фільма, дзеянне яго страціла рытм і камедыйную вастрыню сітуацый... Вясёлая казка ператварылася ў не вельмі звязныя і даволі сумныя павучанні аж на паўтары гадзіны. І не выратавалі яе ні колер, ні лялькі, ні цудоўнае камедыйнае трыо — М. Жараў, Д. Арлоў, М. Яншын. Гэтым выдатным акцёрам не было чаго іграць — такія расплыўчатыя і няпэўныя характары іх герояў. Давялося паказаць умоўныя азначэнні розных чалавечых заган, прычым вельмі павярхоўна.

Лялькам таксама не вельмі пашанцавала. Яны маглі быць больш рухавыя і выразныя.

Прычыны няўдачы цікавай задумы, як нам здаецца, тояцца ў непаўнацэннай літаратурнай аснове фільма. Адсюль бяруць пачатак невыразнасць стылю, недакладнасць адрасу.

На экран выйшла новая камедыя-казка для дзяцей, у якой чараўнік не ўсміхаецца, святочны горад не вельмі радуе, а добрыя думкі не знаходзяць водгуку ў зале...

А. БАБКОВА.

## ШКОЛА ДЛЯ КУЛЬТРАБОТНІКАЎ

Белагрудская сельская бібліятэка Лідскага раёна — адна з лепшых устаноў культуры. Прыемна зайсці ў яе памяшканне. Тут утульна, прыгожа, на сценах — плакаты, стэнды, лозунгі, фотамантажы. Афармлена некалькі кніжных выставак.

Загадвае бібліятэкай былая настаўніца Зінаіда Аляксандраўна Аўсіевіч. Палюбілася ёй гэтая справа.

Лідскі раённы аддзел культуры адкрыў у бібліятэцы раённую школу перадавога вопыту для культасветработнікаў. Тут праходзяць практыку культработнікі Гасцілаўскага, Вавёрскага, Голдаўскага, Белагрудскага сельсаветаў.

Г. МІХАЙЛАЎ.

## ПЕРШЫЯ ГЛЕДАЧЫ — ХЛЕБАРОБЫ

Тэатральны калектыў Палаца культуры завода «Гомсельмаш» закончыў работу над пастаноўкай камедыі драматурга Ягджана «Наглядны ўрок».

— Няхай першымі гледачамі будуць нашы старыя сябры — хлебаробы,— вырашылі самадзейныя артысты і павезлі спектакль да калгаснікаў сельгасарцелі «Перамога» Гомельскага раёна. Прам'ера ў сельскім клубе прайшла з вялікім поспехам.

Удзельнікі тэатральнага калектыву рыхтуюцца зараз да паказу гэтага спектакля ў чырвоных кутках завода, распрацоўваюць маршрут паездак па калгасах Гомельшчыны.

В. СЯМЕНАЎ.

Выходзяць на ЭКРАН

**«ВАЧЫМА ПАЭТА»**
(Лермантаў-мастак)

На матэрыяле малюнкаў, акварэляў і жывапісу М. Ю. Лермантава з шырокім прыцягненнем вершаў у фільме раскрываюцца погляды паэта на навакольны свет. Карціна знаёміць чытачоў з Лермантавым - мастаком, ускрывае глыбокую ўнутраную сувязь яго паэзіі з графікай і жывапісам.

Вытворчасць Ленінградскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтары сцэнарыя — Н. Дунаева і Г. Шабельская, рэжысёр Г. Брусе.

Фільм каляровы, 1 частка, 297 метраў.

**«МАСКВА, ДЗЕНЬ ПАЭЗІІ»**

Савецкая паэзія! Яна паставіла сябе на службу будаўніцтву камунізма. З першых дзён рэвалюцыі вершы загучалі не толькі з кніжных старонак. Гэта добрая традыцыя ў апошнія гады адрадзілася з новай сілай. Маскоўскі Дзень паэзіі стаў штогоднім святам сустрэчы з чытачом.

Нарад кінакарціна прысвечана дзевятаму маскоўскам у Дню паэзіі, паэтам і чытачам, якія прынялі ў ім ўдзел.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтары сцэнарыя — Д. Кавалёў і М. Максімаў, рэжысёр В. Катанян.

Фільм чорна-белы, 2 часткі, 549 метраў.

**«КАРАБЕЛЬ АСОБАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ»**

Гэта захапляючы кінарасказ аб III Сусветнай сустрэчы журналістаў, якая праходзіла на цеплаходзе «Літва».

У карціне паказаны розныя краіны, дзе пабывалі ўдзельнікі форума — Румынія, Балгарыя, Турцыя, Грэцыя, Італія, Алжыр, а таксама шматлікія сустрэчы і канферэнцыі з афіцыйнымі ўладамі гэтых краін, сустрэчы і гутаркі з простымі людзьмі.

У заключным камюніке форума журналісты пяці кантынентаў падтрымалі Маскоўскі дагавор, заклікалі ўмацоўваць адзінства ў барацьбе супраць каланіялізму, за мір на зямлі.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтары сцэнарыя — А. Аджубей, Е. Акуратаў, В. Маеўскі, Ю. Манглоўскі, К. Няпомнячы і Ю. Трушын, рэжысёры-аператары Е. Акуратаў і Ю. Манглоўскі.

Фільм каляровы, 5 частак, 1450 метраў.

**«СВЕДКІ ДАЛЁКАГА МІНУЛАГА»**

Кінастужка расказвае пра помнікі старажытнай культуры, якія захаваліся да нашых дзён: старажытныя рукапісныя кнігі і летапісы, выдатныя выданні рамеснікаў — заснавальнікаў рускага мастацтва, пра архітэктурныя помнікі і Маскоўскі Крэмль — выдатны помнік рускай культуры.

Вытворчасць Маскоўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя — М. Беленькі, рэжысёр Я. Дыхтар.

Фільм каляровы, 1 частка, 296 метраў.

# ФІЛЬМЫ ЗДЫМАЮЦЬ АМАТАРЫ

Чатыры гады назад пры Доме тэхнікі Беларускай чыгункі была створана аматарская кінастудыя. Цяжка было на першым часе студыйцам. Узнікалі дзесяткі пытанняў. Як карыстацца кінакамерай? Як зрабіць раскадроўку? Як абыходзіцца з плёнкай? Якія яе ўласцівасці? Памаглі работнікі Мінскай студыі дакументальных фільмаў і перш за ўсё аператар Ул. Цяслюк.

У першага нашага фільма «Дом тэхнікі» не было сюжэта, ён расказваў аб макетах і стэндах Дома.

Другая работа студыі — «Капрон замест металу» была адзначана дыпломам другой ступені на Усесаюзным аглядзе аматарскіх кінафільмаў у Маскве. Мы ў ёй прабавалі паказаць, як работнікі Гомельскага рамонтна-механічнага завода ў садружнасці з Беларускім інстытутам чыгуначнага транспарту замянілі дарагія каляровыя металы капронавымі дэталямі.

Пра брыгады камуністычнай працы, пра перадавых людзей Беларускай чыгункі апавядае наш фільм «Разведчыкі будучыні».

Стужка «Творца новага» расказвае пра вынаходнікаў і рацыяналізатараў Гомельскай дыстанцыі сувязі П. Кісялёва, М. Суздалева, Р. Крота і Р. Важнікава.

Падарожнічае па экранах Беларусі наша новая дакументальная кінаапавесць «Заслонаўцы сёння». Яе героі — былыя партызаны легендарнай брыгады «Дзядзькі Косці» — славутыя машыністы А. Бухавец, Я. Бокуц, майстар цэха аўтатармазоў Аршанскага паравознага дэпо імя Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава А. Баранаў.

Усе кінафільмы аматарскай кінастудыі чыгуначнага Дома тэхнікі атрымалі пуцёўку на экраны краіны.

В. УШАКОЎ,
інжынер.

На здымку: члены аматарскай кінастудыі пры Доме тэхнікі Беларускай чыгункі — мастак Мікалай Дальчанка і кінамеханік Мая Сплендэр манцыруюць новы кінафільм.

Фота Э. МЫЛЬНІКАВА.

Слова пра малодшага аўтара

# ПЕРШЫЯ РОЛІ

Восенню мінулага года ў канторку інжынера-будаўніка Гродзенскага азотнатукавага завода ўвайшла русавалосая дзяўчына.

— Даруйце, — прыкметна хвалюючыся, загаварыла яна. — Я нядаўна скончыла Мінскі тэатральны інстытут і вось прыехала ў ваш тэатр працаваць актрысай...

— Вельмі прыемна. Давайце знаёміцца, — і інжынер назваў сваё прозвішча.

— Тацяна Мархель, — сказала дзяўчына і, прысеўшы на прапанаваную скрынку з-пад цвікоў, гаварыла далей: — Учора я атрымала ролю будаўніка — Фросі ў п'есе Мітрафанава «Экстранны выклік». А вось пра жыццё і працу будаўнікоў нічога не ведаю...

— Паможам! — усміхнуўся інжынер. — Хадземце, пазнаёмлю з нашымі дзяўчатамі.

Частыя сустрэчы з будаўнікамі, назіранні за іх працаю вельмі памаглі пачынаючай актрысе. Яна не раз трымала ў руках «масцярок», нават даведалася, што такое «ўнутраны» і «вонкавы» шоў кладкі цэглы і многія іншыя прафесіянальныя рэчы. Але галоўнае — ёй сталі блізкія думы, мары і жаданні вясёлых, гаманкіх мантажніц, муляраў з азотнатукавага завода.

Ул. ДЗЁМІН,
артыст Гродзенскага тэатра

△

У спектаклі «Экстранны выклік» маладая актрыса стварыла запамінальны вобраз простай, душэўнай дзяўчыны Фросі. Яе Фрося шчыра радуецца працоўным поспехам сваіх таварышаў, глыбока перажывае непаладкі на будоўлі буйнага прамысловага аб'екта і клапаціва і сардэчна ставіцца да сваіх сяброў. На першых спектаклях не вельмі выразна прайшлі сцэны з Паўлам (актрыса недастаткова глыбока выявіла пачуццё кахання да яго). Тацяна Мархель з дапамогаю рэжысёра пераадолела гэты недахоп і вобраз яе Фросі стаў больш паўнакроўны, шматгранны.

Аб сваёй дэбютнай ролі пачынаючая актрыса шмат чула добрых слоў і ў калектыве тэатра і ад гледачоў. Але, бадай, больш за ўсё яна ўзрадавалася калі пасля аднаго са спектакляў «Экстранны выклік» да яе ў грымёрную зайшла група знаёмых дзяўчат з азотнатукавага завода. Горача віншуючы дэбютантку, яны гаварылі:

— Малайчына, Тачя! Твая Фрося сапраўдны будаўнік! Яна вельмі падобная на нас!..

Да сорак шостай гадавіны Вялікага Кастрычніка калектыў выразшыў падрыхтаваць драму «Порт-Артур» па п'есе А. Сцяпанава і І. Папова. У гэтым спектаклі, пастаўленым галоўным рэжысёрам тэатра, заслужаным дзеячом мастацтва РСФСР А. Струніным, ролю танцоўшчыцы-шпіёнкі Куінсан іграе Тацяна Мархель.

...Лепшы шынок горада Порт-Артура. Сёння тут вялікі князь Кірыл Уладзіміравіч наладжвае баль. Да гасцей — афіцэраў крэпасці падыходзіць Куінсан. У яе кароткай размове з п'янаватымі афіцэрамі Тацяна Мархель паказвае сваю гераіню распешчанай, далёкай ад усялякіх ваенных спраў дзяўчынай. Але вось успамінаецца імя праслаўленага рускага адмірала Макарава. І Куінсан насяроджваецца. І па тым, як яна прыслухоўваецца да апошніх навін у рускай арміі і флоце, і па яе ўважлівых, цікаўных вачах (Тацяна Мархель усё гэта праводзіць тонка) пачынаеш падазраваць, што японскую танцоўшчыцу ў навакольным свеце цікавіць вельмі многае, што яе наўны позірк, бесклапотны жарт — гэта маскіроўка.

Тацяна Мархель у гэтай ролі

карыстаецца скупымі, але выразнымі сродкамі. Яна добра адчувае і даносіць да гледача другі план ролі, які лагічна і паслядоўна раскрываецца ў заключнай частцы карціны. Каларытнаму ўвасабленню вобраза Куінсан памагаюць вакальныя і танцавальныя здольнасці выканаўцы, вельмі патрэбныя ў палітры кожнага драматычнага акцёра.

Пачынаючым акцёрам, на мой погляд, вельмі карысна ды і неабходна выступаць у самых рознахарактарных ролях. Гэта дае магчымасць найбольш усебакова раскрываць іх творчы дыяпазон. Рэжысура Гродзенскага драматычнага тэатра правільна зрабіла, прызначыўшы Тацяну Мархель у казцы «Беласнежка і сем гномаў» на адну з цэнтральных роляў п'есы — ролю каралевы.

Актрыса працавала шмат і з захапленнем. І ад спектакля да спектакля ў выканаўцы ўсё больш рэльефна вырысоўваўся вобраз казачнай валадаркі. Толькі хочацца пажадаць, каб актрыса пазбавілася рысаў бытавізму — спрошчанага жэста, скарагаворкі ў першай частцы спектакля, дзе каралева, як вядома, з'яўляецца ўладаркаю казачнай дзяржавы.

Вясною гэтага года Тацяна Мархель была ўведзена ў спектакль «Драма на паляванні» на ролю Волечкі. Роля складаная, а рэпетыцый было мала. У актрысы былі і бяссонныя ночы, і горкія слёзы. Увесь калектыў спектакля старанна памагаў ёй. І цяпер, калі сыграны рад спектакляў, можна гаварыць пра станоўчыя вынікі работы. Але не ўсё яшчэ даведзена да завершанасці.

У першай дзеі Тацяна Мархель пераканаўча паказвае Волечку гуллівай, не пазбаўленай практычнай кемлівасці, дзяўчынай. Волечка адчувае сілу грошай і дзеля гэтага пагаджаецца выйсці замуж за пажылога аканома багатага маёнтка Урбеніна. У наступных эпізодах, стаўшы паўнаўладнай гаспадыняй у раскошным маёнтку графа Карнеева, Волечка прагне імкнецца да асабістага ўзбагачэння.

Пры правільным выкананні рэжысёрскіх задач, маладой актрысе ў ролі Волечкі не хапае рыс, якія надзейным шчытом павінны маскіраваць і прыкрываць эгаістычныя задумы жанчыны, што прывялі яе ў эксплуататарскім грамадстве да гібелі.

Я як удзельнік спектакля «Драма на паляванні» шмат разоў глядзеў Тацяну Мархель у ролі Волечкі. Радасна, што яна працягвае працу над вобразам, паглыбляе яго. І ўсё ж ёй яшчэ шмат не хапае, каб Волечка атрымалася сапраўдным чэхаўскім персанажам, дакладным і тыповым увасабленнем рысаў адміраючага грамадства.

Тацяне Мархель тармінова давялося ўвесціся ў ролі Надзеі ў спектаклі па п'есе А. Астроўскага «Выхаванка» і Харміяны ў трагедыі В. Шэкспіра «Антоній і Клеапатра». І калі Надзея ў маладой актрысы дастаткова праўдзівая, дык вобразу Харміяны не хапае многіх рыс характарнасці. Тут яшчэ не выкарыстана многае для паглыблення вобраза.

У канцы мінулага сезона Тацяна Мархель атрымала ролю Наташы ў п'есе Юрыя Кляманава «Бялявая бестыя». Яна павінна была на даволі скупым драматургічным матэрыяле стварыць вобраз савецкага афіцэра-сувязіста, які бяссоннымі начамі жыве ля рацыі. Тацяна, працуючы над гэтай роллю, прачытала многія кнігі, дзённікі, успаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, падоўгу раілася з рэжысёрам, распытвала былых воінаў-радыстаў.

І вось Тацяна Мархель у спектаклі «Бялявая бестыя» паяўляецца на сцэне. У мінуты зацішша ў бліндажы, дзе знаходзіцца камандны пункт буйнага злучэння Савецкай Арміі, ля жалезнай печкі, падцягнутая, светларусая Наташа гутарыць з героем п'есы капітанам Флеравым. Увесь гэты дыялог Тацяна Мархель вядзе з пачуццём, праўдзіва.

Усяго за першы сезон сваёй сцэнічнай работы выпускніца Мінскага тэатральнага інстытута сыграла восем роляў. На тры адказныя з іх яна была ўведзена. Я лічу, такая колькасць уводаў небяспечна не толькі для пачынаючай актрысы, але і для вопытнага майстра. Яны садзейнічаюць паяўленню штампаў, перашкаджаюць больш глыбокаму асэнсаванню драматычнага матэрыялу і робяць выканаўцаў роляў прымітыўнымі, далёкімі ад жыццёвай і сцэнічнай праўды.

Гэтыя заўвагі адносяцца і да Тацяны Мархель. Але хоць не ўсе вобразы, створаныя ёю, знаходзяцца на аднолькавым мастацкім узроўні, у яе ёсць рад каштоўных якасцей, перш за ўсё — працавітасць, дасціпнасць у творчых пошуках, любоў нават да самай маленькай ролі. І гэта вельмі каштоўна. Тым больш, што яна маладая.

Сярод кніг

# ГАДЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ

**Анатоль САБАЛЕЎСКІ**

1949 і 1962.

Дзве даты са зборніка п'ес Кастуся Губарэвіча. Першая стаіць пад драмай «Брэсцкая крэпасць», якой адкрываецца кніга. Другая пад апошнім творам — сатырычнай камедыяй «А куды ж нам падзецца». А паміж імі — трынаццаць год. За такі час празаікі найчасцей пішуць аж па некалькі тамоў твораў. Драматург жа напісаў адзін, прытым не вельмі вялікі. Дарэчы, у томік К. Губарэвіча, які мае сціплую і вельмі агульную назву «П'есы», увайшло амаль усё, што напісаў ён у жанры драматургіі (праўда, тут няма лірычнай камедыі «Простая дзяўчына» — мабыць, не хапіла для яе лістажу, бо іншую прычыну знайсці цяжка).

Звернемся ж да тых п'ес, якія трапілі ў кнігу. Напісаныя ў розныя гады і цяпер сабраныя разам, яны даюць мажлівасць гаварыць пра творчасць К. Губарэвіча ў цэлым, рабіць тыя ці іншыя вывады.

Падзеі твораў не змяшчаюцца ў храналагічных рамках кнігі. Зборнік п'ес расказвае пра наша сённяшняе жыццё і далёкае ці больш блізкае мінулае. Гэты летапіс пачынаецца з 1917 года.

Дзеянне гісторыка-рэвалюцыйнай драмы «Галоўная стаўка» пачынае разгортвацца напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў горадзе Магілёве, дзе знайшлі сабе прытулак Галоўная стаўка пры Мікалаі II і сам цар са сваімі памагатымі і падручнымі. Потым грымне і сама рэвалюцыя.

Спачатку да Мікалая II дайшла чутка, што салдаты адмаўляюцца ваяваць, уцякаюць з франтоў. І ад гэтай весткі цар скалануўся, пачаў хадзіць з кутка ў куток, не знаходзячы сабе месца і, заадно зазначым, якога-небудзь пэўнага, разумнага выйсця. А потым праз заслону, мабыць, не вельмі ўжо моцнай і надзейнай царскай аховы прабіўся радавы акопны салдат Сымон Кныш. Ён уварваўся да самога Мікалая II з вялікай скаргай на царскага палкоўніка. І скардзіцца ён не толькі ад сябе асабіста, а—заўважце — ад імя ўсёй роты.

Царскі трон пачаў усё больш хістацца. А потым на нейкі час зусім спусцеў. Увішныя служкі падстаўляюць яго Карнілаву, потым на колькі хвілін самазадаволена рассеўся на ім Керанскі. Але вецер бурных, найвялікшага значэння падзей урэшце змёў і іх сляды. І на тое самае царскае крэсла, на якое садзіліся часовыя яго ўладальнікі, забраўся просты акопны салдат Сымон Кныш і заснуў там моцным сном чалавека з чыстым, спакойным сумленнем...

«Галоўная стаўка» — твор надзвычай багаты на падзеі. Яны ўвесь час нарастаюць, вельмі ж хутка змяняючы адна другую. У іх бярэ ўдзел даволі многа герояў. У такім выпадку можна збіцца на голую хранікальнасць. Але К. Губарэвіч умела пазбягае яе. Шматлікія падзеі тут на дзіва моцна знітоўваюць у адзінае цэлае людзі, удзельнікі гістарычнага канфлікту і героі барацьбы, іменна іх лёс, іх спадзяванні і, нарэшце, здзяйсненні становяцца галоўнымі ў драме.

Аўтар стварае складаныя чалавечыя характары (назаву для прыкладу Сымона Кныша, Мар'ю, генерала Бонч-Бруевіча), паказвае часам далёка не простыя іх узаемаадносіны. Ён умее быць па-сапраўднаму эканомным, умее некалькімі «ніткамі» звязаць усе падзеі твора ў адзін вузел, моцна «прымацаваўшы» да іх і людзей. Часам адным-двума штрыхамі ён малюе вобраз чалавека, паказвае яго характар, яго ўзаемаадносіны з другімі людзьмі, яго стаўленне да тых ці іншых падзей. Наогул, мне здаецца, што «Галоўная стаўка» — самы дасканалы твор Губарэвіча па драматургічнаму майстэрству, па закончанасці шматлікіх эпізодаў і зліцію гэтых эпізодаў у адну цэласную карціну.

Да п'есы ж «Брэсцкая крэпасць» можна адрасаваць пэўныя прэтэнзіі. У гэтай гераічнай драме часам сустракаеш тое, што ў паэзіі называецца рыторыкай, іншы раз ёй нестае цэльнасці, мастацкай завершанасці. І разам з тым, у п'есе ёсць высокі напал чалавечых пачуццяў.

Учынкі людзей, іх «работа» на вайне паказаны як праява высокага гераізму, іх подзвіг даведзены да патэтычнага гучання.

Гаворачы пра драму Кастуся Губарэвіча, нельга забывацца і пра тое, што пісьменнік бадай што першы адкрыў для літаратуры бесмяротную тэму абаронцаў Брэсцкага гарнізона. Іменна з яго твора больш шырока і грунтоўна дазнаўся ўсесаюзны гледач пра неўміручы подзвіг над Бугам. П'есу пісаў драматург у 1949 годзе, калі яшчэ многа чаго хавалася пад руінамі крэпасці і не надта ахвотна рабіліся захады, каб усё гэта вярнуць гісторыі, народу.

К. Губарэвіч не любіць, проста не церпіць дробных тэм, занадта малой тэрыторыі. Ва ўсіх яго п'есах адчуваецца імкненне да маштабнасці. І падзеі ён выбірае найбольш значныя ў жыцці, калі героі, гаворачы словамі драматурга, трапляюць на крутыя павароты.

Адна з яго камедый, якая расказвае пра мірнае калгаснае жыццё, так і называецца — «На крутым павароце». Падзеі яе разгортваюцца якраз у той час, калі ў вёсцы пасля вядомых мерапрыемстваў партыі і ўрада адбываліся вялікія змены, калі некаторыя калгасы, ушчэнт разваленыя ў мінулым, пачыналі станавіцца на ногі.

Драматычная аповесць «Далёкая песня» расказвае пра жыццё беларусаў у далёкай Аргенціне.

І, нарэшце, сатырычная камедыя «А куды ж нам падзецца» прысвечана сучаснасці. Жыццё зноў робіць круты паварот да новага. І тыя, хто выпадкова сядзіць на сваім месцы, не ўтрымаўшыся, ляцяць вобземлю; другія ж—смела, упэўнена ідуць далей, наперад.

На жаль, камедыя «А куды ж нам падзецца» — самая слабая ў зборніку Кастуся Губарэвіча, хоць і тут ёсць трапна вызначаныя чалавечыя характары, узаемадзеянні герояў...

Раён, дзе жывуць персанажы сатырычнай камедыі Кіеня і Хадоська, скасавалі. Былым «наменклатурным адзінкам» пераязджаць у другі які-небудзь раён не выпадае — там яны проста нікому не патрэбны. І вось яны «прыстасаваліся» — адзін стаў кіраваць клубнай работай, другі — пякарняй. Так вось і можна было б сабе жыць, прыпяваючы, тым больш, што яшчэ кожны з іх мае добрую падмогу — уласныя агароды, сады. Дык жа не, і цяпер не даюць спакойна жыць нашым «героям». Задумалі людзі дабіваццa, каб гарадскі пасёлак перадалі ў падначаленне калгаса. І з гэтай прычыны Кіеня з Хадоськам не на жарт заварушыліся, забегалі.

Аднак далей падзеі камедыі развіваюцца даволі слаба. Драматург дачасна заняўся, так сказаць, раззбраеннем герояў. Выяўляецца, што і самі яны і ўсе іх учынкі, намеры вельмі несур'ёзныя. Аўтар надзвычай старанна і даволі доўга нам гэта даказвае, ілюструючы рознымі прыкладамі. І сама камедыя таксама пачынае набываць ілюстрацыйны характар.

На шчасце, у драматургіі Губарэвіча ілюстрацыйнасць — даволі рэдкая, хутчэй за ўсё выпадковая госця. Найбольш агульныя недахопы яго твораў маюць іншы характар. Гэта, калі гаварыць коратка, — службовасць некаторых герояў. Амаль ва ўсіх драмах пісьменніка, у цэлым цікавых, хвалюючых, ёсць асобы, якія адыгрываюць выключна службовую ролю. Яны ўплываюць на развіццё падзей найчасцей толькі па падказцы аўтара, так сказаць, па шпаргалках драматурга. Напрыклад, Кудрэвіч у камедыі «А куды ж нам падзецца» павінен дзейнічаць толькі для таго, каб даказаць, што адмоўныя героі Кіеня і Хадоська памыляюцца, што наогул нікчэмныя ў іх справы. Абавязкі ж другога персанажа з гэтага твора — Мікуліча якраз супрацьлеглыя — усяляк падкрэсліць розум і спрыт гераіні Скібкі.

Службовыя асобы найчасцей выказваюць вельмі правільныя думкі. Напрыклад, Нарановіч з камедыі «На крутым павароце». Гаворыць ён, мабыць, эмацыянальна — амаль што ні сказ, то клічнік ці пытальнік. І тым не менш, словы яго занадта афіцыйныя, казённыя, па-пратакольнаму халодныя.

Службовыя асобы — гэта хутчэй цені, якія самотна блукаюць па творах. Але яны не ствараюць надвор'я, ва ўсякім выпадку даволі нязначна ўплываюць на «тэмпературу» твора ў цэлым.

Драматычныя ж падзеі ў п'есах Кастуся Губарэвіча вядуць сапраўдныя героі твораў. І амаль ва ўсіх іх ёсць вельмі характэрная, вызначальная рыса — народнасць. Вось, скажам, драма «Далёкая песня». Усе асноўныя падзеі твора разгортваюцца ў Аргенціне. Але якія блізкія, родныя, вельмі беларускія ў экзатычнай для нас краіне Вінцэсь Крыўчэня і яго жонка Куліна, даўным-даўно закінутыя цяжкім лёсам на чужыну! Вось чаму становяцца асабліва зразумелымі, блізкімі іх сум і туга па сваім родным кутку, па сваёй Айчыне.

Вядома, кожнаму драматургу хочацца ствараць яркія, каларытныя вобразы, глыбока народныя па сутнасці. Але ў некаторых творах нярэдка «народнасць» дасягаецца толькі прымаўкамі ды простанароднымі слоўцамі.

Лепшыя героі драматычных твораў К. Губарэвіча не становяцца ў позу, каб весці паміж сабою дыялог на ўзроўні народных пагаворак і прымавак. Але ўсё тое, што яны кажуць, — гэта іх уласнае, усё яно арганічна ўплятаецца ў чалавечы характар. У герояў К. Губарэвіча не толькі словы, а сам лад думак — беларускі, глыбока народны.

Найлепш за ўсё адчуваю сябе пісьменнік у бытавой сферы. Калі ж гаварыць больш дакладна — асабліва добра ўдаецца яму перадаць побыт, лад думак сялян. Тут, можна лічыць, яго родная стыхія, тут ён адчувае сябе сапраўды як дома.

Увагу драматурга больш за ўсё прыцягваюць так званыя простыя, самыя радавыя людзі. Яны найчасцей і становяцца галоўнымі героямі драматычных твораў, даюць пэўны ход падзеям, вызначаюць іх кірунак. Яны ж, дарэчы, атрымліваюцца і самымі яркімі, каларытнымі. У «Галоўнай стаўцы» такім героем з'яўляецца салдат Сымон Кныш, між іншым, селянін. Самы яркі, паўнакроўны вобраз у «Брэсцкай крэпасці» — радавы баец Кукушкін. Лепшымі вобразамі «Далёкай песні» з'яўляюцца Куліна і Вінцэсь — сяляне. У п'есах «На крутым павароце» і «А куды ж нам падзецца» драматург добра паказаў вясковы побыт, і найбольш цікавыя ў іх чалавечыя характары — простыя сяляне.

Не, у творах Кастуся Губарэвіча бяруць удзел не толькі сяляне. Ёсць у іх і інтэлігенцыя, і прадстаўнікі гераічнага рабочага класа. Адны з іх напісаны больш выразна, другія ж — менш. Але, калі гаварыць увогуле, гэтыя героі змушаны саступаць дарогу, прапускаць наперад іншых.

Гэта, вядома, засмучае. Радуе ж (і гэта галоўнае ў творчасці Губарэвіча), што драматург умее глыбока, па-народнаму паказаць чалавечыя характары самых радавых людзей, якія ў гады Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзялі ўладу ў свае рукі, якія адстаялі яе ў суровых баях Айчыннай вайны і якія цяпер, пераадольваючы на сваім шляху розныя цяжкасці і перашкоды, увесь час няўхільна рушаць наперад.

Кастусь Губарэвіч. «П'есы». Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1963 г.

## З ПУЦЁЎКАЙ ЛЕКЦЫЙНАГА БЮРО

Расоны, Ушачы, Верхнедзвінск, Глыбокае, Лепель, Браслаў наведалі артысты лекцыйнага бюро Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Брыгада прачытала лекцыі «Беларуская музыка», «П. І. Чайкоўскі», «Роля музыкі ў камуністычным выхаванні».

20-годдзю Польскай Народнай Рэспублікі была прысвечана лекцыя «Польская музыка».

Б. ФРЭЙДКІН, настаўнік.

## ПОСПЕХ МАЛАДОЙ СПЯВАЧКІ

З гастрольнай паездкі ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку і Польскую Народную Рэспубліку вярнулася канцэртная брыгада, якая складаецца з пераможцаў Усесаюзнага агляду мастацкай самадзейнасці прафсаюзаў 1963 года.

У складзе гэтай брыгады была салістка Брэсцкага народнага хору Вольга Шутава. Яе выступленні за рубяжом, як і выступленні ўсёй брыгады, праходзілі з вялікім поспехам.

Ул. ГУРДА.

## РАДКІ З ПІСЬМАЎ

△ У Старобінскай дзіцячай бібліятэцы, бадай, няма такога чытача, які б не прачытаў кніжку беларускага аўтара Анатоля Чаркасава «Цудоўны камень». Вось чаму ў вучняў мясцовай школы было шмат радасці, калі яны даведаліся аб прыездзе ў бібліятэку аўтара кнігі. А. Чаркасаў расказаў аб працы над кнігай, аб сустрэчах з шахцёрамі Салігорскага калійнага камбіната.

П. БАРОДКА.

△ На сродкі калгаса імя XXII з'езда КПСС Жыткавіцкага раёна тут пабудаваны клуб. У ім глядзельная зала на 150 месц, бібліятэка і чытальная зала. На адкрыцці клуба з канцэртам перад калгаснікамі выступіла агітбрыгада Жыткавіцкага РДК.

Новыя клубы будуюць калгасы імя Жданава, «Шлях да камунізма», імя Куйбышава і інш.

Я. АЛЬБЕРСОН.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

# ПОДЗВІГ, РОЎНЫ ВОІНСКАМУ

У дні святкавання 20-годдзя вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гарадскім парку культуры і адпачынку адкрылася выстаўка франтавых малюнкаў удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны, былога гвардыі радавога артылерыйскага палка Соф'і Сяргееўны Уранавай. У маі 1942 г. маскоўская мастачка Соф'я Уранава пайшла добраахвотна ў Савецкую Армію і прайшла баявы шлях ад Арла да Вітэнберга на Эльбе.

Цяпер, праз дваццаць гадоў, накіды і малюнкі, зробленыя мастачкаю ў баявой абстаноўцы на перадавой, часта пад агнём праціўніка, у медсанбатах, сярод руін толькі што вызваленых населеных пунктаў, робяць вялікае ўражанне.

Выстаўку наведваюць сотні людзей.

«...Наша дарагая і паважаная аднапалчанка Соф'я Сяргееўна! — пішуць у кнізе водгукаў удзельнікі вызвалення Брэста Герой Савецкага Саюза гвардыі генерал-лейтэнант Д. Малькоў і афіцэр А. Кавіцкі. — З хваляваннем і вялікай увагай мы прагледзелі выстаўку такую дарагую і блізкую нам, непасрэдным удзельнікам баёў з фашыстамі... У кожным вашым малюнку, кожным вобразе ёсць непаўторнасць, прыгажосць і сіла, дакладнасць і строгасць. Рады за вас, што вы так сціпла з дня ў дзень выконваеце свой творчы абавязак...»

На гэтай выстаўцы — невялікая частка твораў мастачкі. Іх можна падзяліць на пяць серый: «На Арол», «Днепр», «Беларусь», «Брэст», «Прыбалтыка». У малюнках, накідах, непасрэдна ўзятых з жыцця, адчуваецца добрая рэалістычная школа, якую мастачка прайшла ў сваіх настаўнікаў — выдатнага рускага мастака М. Несцерава і лаўрэата Ленінскай прэміі П. Корына. Гэтыя творы маюць і мастацкую і гістарычную каштоўнасць («Арлоўскі напрамак 1943 г. Гаўбіцы нашай батарэі вядуць агонь за Аку», «Бярозавы гай, адкуль пачалося наступленне»).

З серыі «Днепр» цікавыя замалёўкі партызан з Духоўшчыны, якія памаглі наладжваць пераправу. «Яны фарсіравалі Днепр» — закончаны твор станковай графікі, ён надзвычай востры і пранікнёны па псіхалагічнай выразнасці. Вясковая хата часова ператворана ў медсанбат. Клапатлівая гаспадыня прынесла кубак малака для параненых салдат, якіх толькі што вынеслі з бою. Перавязаныя бінтамі, яны чакаюць адпраўкі ў тыл. У думках яны яшчэ там — у атмасферы бою, сярод таварышаў на перадавой. Праз незвычайнае напружанне і стомленасць салдат мастачка перадае ўсведамленне імі выкананага абавязку, упэўненасць у перамозе.

З серыі «Беларусь» прыцягваюць увагу пейзажы «Гарыць беларуская зямля» (1944 г.), «Родныя хаты (вёска Якашэвічы, Мазыр — Калінкавічы)», кампазіцыя «З фронту вестак няма». Знявечаная, але нескораная зямля Беларусі, што дачакалася свайго вызвалення, зрэзаныя снарадамі вершаліны дрэў, дымныя руіны, разбураныя хаты і адзінокія фігуры жанчын, якія чакаюць вестак з фронту ад блізкіх і сваякоў, — усё гэта стварае асаблівы, драматычны настрой.



С. УРАНАВА. «Пісьмо на радзіму».

Нядаўна мастачка наведала вёскі Хабы і Буякі Цяльшанскага сельсавета, дзе дваццаць гадоў назад рабіла замалёўкі. Разам з жыхарамі яна аглядала месцы мінулых баёў на подступах да Брэста.

Гар, руіны, разбураныя вуліцы, узарваны мост ля вакзала, сапёры з мінашукальнікамі — такім паказала мастачка Брэст у дзень яго вызвалення. У Брэсцкай сюіце асаблівую ўвагу прыцягваюць два малюнкі з фонду Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі—«Герой Савецкага Саюза В. І. Акімаў цяжка паранены» і «Пісьмо на радзіму». Вайна — не толькі барацьба са зброяй у руках, але і нялёгкія працоўныя будні. У малюнках «Палітгутарка. Эшалон ідзе на Рыгу», «Будуюць бліндажы», «На ваенных дарогах (Бежанцы. Сям'я)», «Снеданне ля паходных кастроў» — не раўнадушная фіксацыя фактаў, а хвалюючае стаўленне мастачкі да падзей, удзельніцай якіх была яна сама.

Вялікі ліст «Бераг Одэра. 1945. (Тут перайшла Одэр наша дывізія)» нібы завяршае экспазіцыю выстаўкі. Маляваны неласрэдна з натуры, пад мінамётным абстрэлам, ён лаканічны і суровы па танальнасці.

Вялікі баявы шлях прайшла мастачка па дарогах вайны. Подзвіг яе ў мастацтве роўны воінскаму.

Дэпутат Массавета, член ваенна-шэфскай камісіі Саюза мастакоў РСФСР С. Уранава — у страі барацьбітоў за мір. Усёй сваёй творчасцю яна гаворыць:

— Гэта не павінна паўтарыцца!

П. ДУРЧЫН, мастак.

Брэст.

# У РЭПЕРТУАР ХОРАЎ І САЛІСТАЎ

**А. РАКАВА**

Аматары харавой і вакальнай музыкі знойдуць нямала каштоўнага ў новых зборніках песень, якія выйшлі нядаўна ў выдавецтве «Беларусь». Апублікаваны самыя розныя песні. Розныя і іх аўтары.

З хваляваннем бярэш у рукі з густам афармлены зборнік вакальных твораў М. Чуркіна. Адна з трох песень, змешчаных у гэтым маленькім зборніку, напісана нядаўна. Яна называецца «Як светла сёння ў кожным сэрцы» (словы К. Кірэенкі) і прысвечана XXII з'езду КПСС. Светла, сардэчна спявае кампазітар аб нашай партыі, аб савецкім чалавеку, будаўніку камуністычнага грамадства.

Дзве другія песні — лірычныя: «Серэнада» (словы А. Ушакова) і «Вішанька» (словы С. Даяргая). Напісаныя простай, шчырай музычнай мовай, яны кранаюць сваёй сардэчнасцю. Думаецца, імі зацікавяцца ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці і ўключаць іх у рэпертуар.

Выдадзены і тры песні Д. Лукаса аб працаўніках Полацкага нафтабуда. Д. Лукас шмат разоў бываў на нафтагіганце, сустракаўся з будаўнікамі маладога беларускага горада. Там жа кампазітар пазнаёміўся з пачынаючымі паэтамі, якія і напісалі па яго просьбе тэксты. «Песня камуністычных брыгад Полацкага нафтабуда» (словы М. Кускова і В. Шыша), «Песня полацкіх студэнтаў» (словы М. Стадольніка) і «Песня камуністычнага экіпажа Анатоля Крэменя» (словы В. Лукшы) нарадзіліся пад уражаннем гераічных спраў працоўнай моладзі ўдарнай камсамольскай будоўлі — тых, хто прымаў непасрэдны ўдзел у стварэнні першынца хімічнай індустрыі рэспублікі.

А вось яшчэ адна навінка— зборнік песень самадзейнага кампазітара з Гродна А. Шыдлоўскага. Некаторыя змешчаныя ў зборніку харавыя і сольныя творы, у прыватнасці, «Гродзенскі вальс», «Колькі ў небе зор» («Беларускі вальс»), «Беларусь Савецкая» ўжо даўно карысталіся заслужанай любоўю ўдзельнікаў самадзейнасці рэспублікі. Іх з прыемнасцю будуць спяваць і новыя выканаўцы.

У зборніку А. Шыдлоўскага 31 твор — патрыятычныя, лірычныя, салдацкія песні. Усе тэксты да іх кампазітар напісаў сам. У іх услаўляюцца прыгажосць родных прастораў, цудоўны Нёман, высокія чалавечыя пачуцці, небывалыя здзяйсненні нашага народа. Да найбольш удалых песень, апроч названых, трэба аднесці «Ой ты, Нёман родны», «Ой, саколік мой малы», «Там, пад гаем». Мелодыі гэтых твораў яркія, выразныя, даступныя.

Аднак сустракаюцца ў зборніку А. Шыдлоўскага і песні, у якіх адчуваецца пэўны трафарэт. Многія мелодыі, нягледзячы на розны змест тэксту, успрымаюцца, як блізкія «сваякі». Калі песня даецца ў міноры, дык ужо следам за першай музычнай фразай абавязкова чуецца другая ў паралельным мажоры. Вазьміце «Ой, у полі дуб высокі», «Над краінай свеціць ясная зара», «Я салдат, служу Радзіме», «Выйдзі, выйдзі, дзяўчына», «Паглядзі, мой дружа» — усе гэтыя песні пабудаваны па адной і той жа лада-гарманічнай схеме. Арыгінальнасць жа, свежасць мелодыі, як вядома, — зарука паўнакроўнага жыцця песні. Пра гэта трэба заўсёды памятаць яе стваральнікам.

Шкада, што ў зборніку адсутнічае хаця б невялікая біяграфічная даведка пра аўтара песенных тэкстаў і музыкі — А. Шыдлоўскага, чыя творчасць вырасла з народных глыбінь.

«Чакаю цябе» — так называецца зборнік лірычных песень савецкага кампазітара А. Аверкіна, выпушчаны выдавецтвам «Беларусь» па заказу Палітупраўлення пагранвойск. Характэрна, што з апублікаваных дваццаці пяці песень сем напісана на вершы Г. Навасёлава.

Песні А. Аверкіна, змешчаныя ў зборніку, прысвечаны ў большасці воінам граніцы. Лепшыя з іх прасякнуты цеплынёй, пачуццём высокага патрыятызму. «Чакаю я цябе» (словы І. Дрэмава), «Мілая мама» (словы І. Лашкова), «На пабыўку едзе» (словы В. Бокава) — гэтыя песні, упершыню выкананыя вядомай спявачкай Людмілай Зыкінай, набылі надзвычайную папулярнасць.

Ёсць у зборніку песні, напісаныя ў духу рускіх народных «страданняў» або частушак, якія таксама карыстаюцца любоўю слухачоў («Тэрзень-верзень» — словы народныя, «Ідзі старонкаю» — словы В. Бокава, «Шчырыя хлопцы» — словы А. Віхрава).

Але не ўсе вакальныя творы гэтага зборніка раўнацэнныя па мастацкіх якасцях Некаторыя з іх не маюць той меладычнай яркасці, шчырасці, уласцівых лепшым песенным творам А. Аверкіна. Іншы раз кампазітар меладычна паўтараецца (напрыклад, у песнях «Тэрзень-верзень» і «Шчырыя хлопцы»), а іншы раз нават і запазычае інтанацыі вакальных твораў другога аўтара (песня «У цёмную ноч»).

І ўсё-такі большасць песень А. Аверкіна будзе ахвотна выконвацца спевакамі-аматарамі.

Тыражом у 50 тысяч экземпляраў выдадзены «Песні перамогі». Гэта прыгожа афармленая кніжачка, у якой — 31 песня. Амаль палавіна з апублікаваных твораў належыць беларускім аўтарам. Астатнія — песні героіка-патрыятычнага зместу — створаны ў асноўным кампазітарамі іншых рэспублік Савецкага Саюза.

Але, на жаль, у гэтым зборніку надрукаваны толькі адны тэксты песень. Хай бы ўжо змясцілі хоць адну мелодыю без акампанементу. А так песеннік мае выгляд звычайнага зборніка вершаў.

Чаму так адбылося? Выяўляецца, што работнікі кнігагандлю паставілі перад выдавецтвам такую недарэчную ўмову: калі песеннік будзе выпушчаны толькі з аднымі тэкстамі, яны возьмуць для распаўсюджання сорак тысяч экземпляраў, калі з музыкай — самае большае дзесяць тысяч.

Наогул у выдавецтве «Беларусь» вельмі няправільныя адносіны да друкавання зборнікаў песень. Рыхтуецца да друку яшчэ адзін такі спеўнік, куды ўвойдзе каля 120 папулярных твораў савецкіх кампазітараў. Гэта быў бы вельмі патрэбны зборнік, калі б у ім былі змешчаны і ноты песень. На самай справе, аматары музычнага мастацтва не заўсёды могуць правільна запомніць усе тыя напевы, якія ім даводзіцца чуць па радыё. Яны часта запамінаюць мелодыі ў няправільным выглядзе, а пасля так іх спяваюць і вучаць іншых... Па прыклады хадзіць далёка не трэба. На аглядах мастацкай самадзейнасці і нават у запісах па радыё даводзіцца нярэдка чуць фальшыва завучаную мелодыю. І дужа цяжка потым пераўчваць выканаўцаў, якія да яе прызвычаіліся.

Размовы аб тым, што наша моладзь быццам бы не ведае музычнай граматы і таму ёй непатрэбны спеўнікі з музыкай, — проста недарэчныя. На кожным прадпрыемстве ёсць калектывы мастацкай самадзейнасці, музычныя школы, у агульнаадукацыйных школах — музычныя гурткі і ўрокі спеваў, існуюць універсітэты культуры. Шмат ёсць разнастайных магчымасцей навучыць нашу моладзь музычнай грамаце. Як пасля гэтага работнікі кнігагандлю могуць гаварыць: «Нотаў гэтых усё роўна ніхто не разбярэ, іх не варта друкаваць!»

Я лічу, што такія размовы прыносяць яўную шкоду музычна-эстэтычнаму выхаванню нашай моладзі.

СЛОВА БЯРЭ ЧЫТАЧ

## РОССЫП ДАСЦІПНЫХ ДУМАК І ТРАПНЫХ НАЗІРАННЯЎ

У шостым нумары «Маладосці» я прачытаў вельмі цікавыя мініяцюры Янкі Брыля «Рамонкавы россып». Усё тут своеасаблівае, самабытнае і свежае. Кожная мініяцюра, рэпліка, заўвага, маленькая гумарэска напоўнена глыбокай думкай. Вось, напрыклад, здавалася б, простая заўвага. Пашляк на пенсіі. Ходзіць у нядзелю з жонкай па могілках і радуецца, што на помніках — «так многа маладзейшых за яго». Колькі тут іроніі і гневу!

А вось светлае і чыстае... Хвароба прыкавала маці да ложка, адабрала ў яе мову. Да яе прыляцеў сын, вучоны, былы франтавік. Два дні прасядзеў ён над ёю, не заплюшчваючы вачэй. На трэці дзень маці апрытомнела і першае, што яна спытала:

— А ці абедаў жа, сынок?..

Пісьменнік вельмі тонка прыкмячае самыя інтымныя бакі жыцця чалавека. І калі чытаеш яго кароценькія мініяцюры, нават на душы цяплее і за «непрыглядным і звычайным у жыцці» вучышся пазнаваць прыгажосць і незвычайнасць, якая акружае нас з усіх бакоў.

А колькі фарбаў, любві і паэзіі ў замалёўках роднай беларускай прыроды! Прачытаеш такое і задумаешся: «Як жа я не здолеў раней убачыць гэтага сам?»

Няма сэнсу падрабязна пераказваць «Рамонкавы россып». Змест тут такі ёмісты і выразны, што немагчыма яго пераказаць сваімі словамі.

Чытаецца «Рамонкавы россып» за адзіц прысест, а потым хочацца яшчэ і яшчэ раз вярнуцца да яго.

Хочацца параіць усім, хто любіць літаратуру «дарог, сустрэч, уражанняў, падарожжаў», прачытаць гэтыя старонкі «Маладосці».

А. ЛОУГАЧ, інжынер.

г. Мінск.

ЗНАХОДКІ У КНІЖНЫМ МОРЫ

# ГАЛАСЫ МІНУЛАГА

**А. МАЛЬДЗІС**

△

## ПАДАРОЖНІКІ АБ БЕЛАРУСІ

Першая палова XIX стагоддзя... Па высаджаных бярозамі беларускіх гасцінных імчацца карэты і фурманкі. Адны запрэжаныя паштовай тройкай, а то і шасцёркай, другія — уласнымі стаеннікамі. На беларускую зямлю пазіраюць вочы — часам халодныя і абыякавыя, але часцей за ўсё сяброўскія і ўважлівыя. Яны прыкмячаюць, як жыве і працуе беларускі селянін. А потым, вечарам, пры цьмянай карчомнай свечы, падарожнікі заносяць у дзённікі свае ўражанні. Дзённікі гэтыя часцей за ўсё кладуцца ў сямейны куфар. Але часам, набраўшыся смеласці, аўтар пасылае іх у рэдакцыю часопіса ці кнігавыдаўцу..

Больш паўтара стагоддзя назад праязджаў з Пецярбурга ў Бесарабію нямецкі барон фон Кампенгаузен. Яго «Заўвагі аб Малдавіі, Бесарабіі, Крыме, Беларусі і Украіне» былі затым перакладзены на рускую мову і ў 1810 г. надрукаваны ў «Журнале новейших путешествий». Нямецкі арыстакрат не мог не адзначыць, што «Беларусь бедная і малалюдная», а беларускія сяляне працуюць на пана не менш чатырох дзён у тыдзень. Адзінае, што спадабалася аўтару, — гэта «лепшыя ў Еўропе» беларускія дарогі і вонкавы выгляд Магілёва. Часам, аднак, барон імкнуўся надаць сваім нататкам умоўную займальнасць, вышукваў «экзотыку», і тады з'яўляліся радкі: «Беларускія сяляне... носяць шэрыя валяныя шапкі, берасцяныя лапці; шляхціцы, г. зн. дваране, вызначаюцца чорнымі паясамі і шпагамі. Яны служаць у знатных паноў пастухамі і карыстаюцца той перавагай, што іх сякуць не інакш як на рагожы. Амаль ва ўсіх сялян доўгія шыі, з дапамогай якіх яны бесперапынна ківаюць галовамі». Усё гэта папахвае «развесистой клюквой»...

Значна больш добрасумленным было апісанне другога падарожніка — вядомага польскага пісьменніка Ю. Нямцэвіча. Ён пабываў у Беларусі двойчы — у 1816 і 1819 г. Другое выданне яго дарожных нататак убачыла свет у Пецярбургу ў 1859 годзе.

Асаблівае месца ў «Гістарычных падарожжах» Ю. Нямцэвіча адведзена Брэсту. Прыгадваецца мінулае горада, у якім была закладзена адна з першых у Беларусі друкарань. Сучасны стан Брэста і яго ваколіц не задавальняе аўтара, і ён марыць аб часе, калі цывілізацыя парушыць мясцовую глуш, горад ператворыцца ў вялікі гандлёвы порт, а «пладамі Еўропы і Азіі запоўняцца рэчышчы Буга і Мухаўца». Тут жа Ю. Нямцэвіч высока ацэньвае заслугі Зарыяна Далэнгі-Хадакоўскага ў збіранні беларускага фальклору. Апрача Брэста польскі пісьменнік наведаў Гродна, Навагрудак, Бярозу, Пінск. Апісанні гэтых гарадоў перамяжоўваюцца з дакументамі аб іх мінулым.

У першай палове XIX ст. у Беларусі пабывалі яшчэ два польскія падарожнікі. У 1843 годзе варшаўскі часопіс «Пшэглёнд науковы» надрукаваў нарыс Мазура з Плоччыны (Яна Маяркевіча) «Успаміны аб падарожжы па Літве, Русі Чорнай і Русі Белай». Аўтар выказвае спачуванне беларусам, якія «заўсёды занятыя і цяжка працуюць», дае апісанні адзення, жылля і прылад працы беларускіх сялян. Шлях Маяркевіча з Варшавы ў Маскву ляжаў праз Брэст, Слонім, Нясвіж, Мінск, Барысаў і Оршу. Пішучы пра апошні з гэтых гарадоў, аўтар не без падстаў усклікаў: «Ніколі ў жыцці я не бачыў больш сумнага горада, чым Орша!».

У 1829 годзе па Палессі падарожнічаў Казімеж Контрым. Яго як служачага Польскага банка менш цікавіў побыт беларускага селяніна, яго фальклор. Асноўную ўвагу К. Контрым звярнуў на эканоміку Палесся, на перспектывы развіцця прамысловасці і гандлю. Побач з гэтым у сваёй кнізе, выдадзенай у 1839 г. у Познані, падарожнік апісаў раслінны і жывёльны свет у басейне Прыпяці.

Дарожныя нататкі Кампенгаузена, Нямцэвіча, Маяркевіча і Контрыма маюць значную пазнавальную цікавасць. Мне здаецца, што можна было б выбраць найбольш цікавыя мясціны з гэтых нарысаў і пераўдаць іх, дадаўшы апісанні з дарожных дзённікаў П. Шпілеўскага, Б. Дыбоўскага, І. Дамейкі, К. Ельскага, С. Лашкарова, І. Галавінскага і іншых беларускіх падарожнікаў XIX ст, а магчыма і не толькі XIX. Атрымалася б цікавая кніга, асабліва для дзяцей і юнацтва.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# «УРАЖАННЕ— БАГАТАЕ...»

45 дзён у выставачнай зале Пінскага краязнаўчага музея экспанаваліся графічныя і жывапісныя работы Аляксандра Векслера. Наведвальнікі (а выстаўку паглядзела 7831 чалавек, былі наладжаны 63 экскурсіі) адчувалі сапраўднае задавальненне ад твораў самадзейнага мастака. Пра гэта сведчаць многія водгукі ў кнізе гледачоў. Прывядзём некаторыя:

«Уражанне — багатае. Жадаем вялікіх поспехаў. Чакаем Вас у родным Ленінградзе. Лідзія і Генадзь Альхоўскія».

«Хочацца ад душы падзякаваць аўтару за цудоўныя пейзажы і гравюры. Шчаслівай дарогі Вам у мастацтва. Спадзяюся пабываць на Вашай выстаўцы ў нас, у Маскве. В. Багданава».

«Радасна ад адной думкі, што побач з табою жыве такі чалавек, як аўтар гэтай дзівоснай выстаўкі. Няхай яму заўсёды садзейнічае творчая ўдача! С. Шапіра».

Хто ж такі аўтар гэтых работ?

Аляксандр Леанідавіч Векслер — рабочы суднабудаўнічага-суднарамонтнага завода, студэнт-завочнік Маскоўскага паліграфічнага інстытута, былы рачнік-дняпровец, удзельнік баёў за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго выстаўка — вынік работы на працягу амаль шасці гадоў. Нялёгка працаваць на заводзе і адначасова вучыцца ў інстытуце, клапаціцца пра сям'ю, ды яшчэ і маляваць...

Выставіўшы на суд грамадскасці 106 работ, аўтар тым самым прадэманстраваў і працаздольнасць, і ўлюбёнасць у прыгажосць роднай прыроды, і цікавасць да спраў і думак сучаснікаў.

У работах, выкананых у тэхніцы маслянага жывапісу, акварэлі, гуашы, алоўка, тушы, і ў тэхніцы гравюры (афорт, сухая іголка, лінаграв

## ШЧАСЛІВЫХ ГАСТРОЛЯЎ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

5 жніўня ў Мінску, у памяшканні Тэатра оперы і балета, пачаліся гастролі Маскоўскага драматычнага тэатра імя К. С. Станіслаўскага.

Ад імя беларускіх артыстаў і гледачоў гасцей вітала заслужаная артыстка БССР З. Браварская. Яна выказала радасць усіх прысутных з прычыны новай сустрэчы беларускіх гледачоў з тэатрам, спектаклі якога палюбіліся ім у час мінулых гастроляў.

Са словам у адказ выступіў заслужаны артыст РСФСР Б. Львоў-Анохін— галоўны рэжысёр Тэатра імя К. С. Станіслаўскага.

Затым масквічы паказалі спектакль па п'есе М. Булгакава «Дні Турбіных». У спектаклі прынялі ўдзел заслужаны артыст РСФСР А. Глазырын (Мышлаеўскі), заслужаны артыст РСФСР П. Глебаў (Студзінскі), заслужаны артыст РСФСР Я. Ляонаў (Ларыосік), заслужаны артыст РСФСР Б. Ліфанаў (Максім), артысты М. Салант (Аляксей Васільевіч Турбін), Ю. Грабеншчыкаў (Мікалай Турбін), Н. Весялоўская (Алена Васільеўна), Л. Ялагін (Тальберг), В. Беланоўскі (Шарвінскі) і іншыя.

Рэжысёры спектакля — народны артыст СССР М. Яншын і С. Туманаў. Афармленне мастака — заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР Б. Эрдмана. Вёў спектакль І. Ушакоў.

Гастролі адбываюцца на дзвюх пляцоўках — у памяшканнях Тэатра оперы і балета і акружнога Дома афіцэраў.

На здымку: сцэна са спектакля «Дні Турбіных». У цэнтры Аляксей Турбін — артыст М. Салант.

# ПАРТРЭТЫ І ЭПОХА

*Да VII Міжнароднага кангрэсу антраполагаў і этнографаў падрыхтавана выстаўка рэканструкцый аблічча людзей розных эпох, выкананых прафесарам М. Герасімавым.*

Па чэрапу, які праляжаў каля 400 гадоў у магільні цароў у Маскоўскім Крамлі, антраполаг прафесар Міхаіл Герасімаў стварыў скульптурны партрэт цара Івана Грознага. Вузкі доўгі твар, высокія вочніцы, моцна выступаючы асіметрычны нос, розныя па велічыні вочы — такое вонкавае аблічча Грознага. Гэта адзінае адлюстраванне цара Івана, выкананае ў рэалістычнай манеры і, відаць, найбольш праўдзіва.

За трыццаць сем гадоў прабывання на рускім прастоле Іван Грозны заслужыў сабе супярэчлівую славу настойлівага, энергічнага палітыка і чалавека вельмі неўраўнаважанага, магчыма, нават псіхічна непаўнацэннага. Шалёныя маленні, пасты, самапрыніжэнні ў яго чаргаваліся з разгулам і тэрорам. Супярэчлівыя звесткі аб акалічнасцях яго смерці. Хадзілі чуткі, што цара задушылі. Па іншых крыніцах, ён памёр ў прыпадку лютасці ў час гульні ў шахматы. Ёсць версія, што ён пакутваў нейкай дзіўнай хваробай, цела яго распухла, а ўнутранасці «згнілі».

Усё гэта было абвергнута, калі вясною 1963 года ў Архангельскім саборы Маскоўскага Крамля ўскрылі чатыры саркафагі царскай магільні. Сярод іх былі пахаванні Івана Грознага і яго двух сыноў— Івана, які загінуў ад рукі бацькі, і Фёдара. Шкілеты абодвух царэвічаў вельмі разбурыліся ад часу, але шкілет самога Грознага захаваўся адносна нядрэнна. Даследуючы яго астанкі, савецкі антраполаг, археолаг і скульптар прафесар Міхаіл Герасімаў устанавіў, што Іван не быў задушаны, таму што засталіся цэлыя храсткі гартані; яго і не атруцілі, таму што слядоў атруты не знойдзена; не хварэў ён і сіфілісам, наперакор чуткам. Найбольш верагодная прычына смерці — гіпертанічная хвароба. Перад смерцю цар меў рост 1 метр 78 сантыметраў і важыў каля 95 кілаграмаў.

На думку аўтара скульптурнага партрэта, твар Грознага быў непрыгожы, нават адштурхоўваючы, але ён не насіў адзнакаў разумовай адсталасці або набытай дэгенератыўнасці, што ўзнікаюць, напрыклад, у наркаманаў. Псіхалагічную характарыстыку першага цара зможа, відаць, даць на аснове гэтай скульптуры спецыяліст-псіхолаг.

— Я ж не бяруся рабіць якіх-небудзь ацэнак, — сказаў мне Міхаіл Герасімаў. — Я проста ўвасобіў у адчувальную, васковую форму тое, аб чым мяне інфарміраваў чэрап.

### ЧЭРАП НЕ МЕНШ ВЫРАЗНЫ, ЧЫМ ТВАР

Прафесар Герасімаў (яму 57 гадоў) зрабіў скульптурны партрэт Івана Грознага, карыстаючыся распрацаванымі ім метадамі аднаўлення твару па чэрапу. Тэарэтычныя разлікі метаду такія ж складаныя, як і складаны сам працэс рэканструкцыі. Навуковае абгрунтаванне магчымасці ўзнавіць дакладны партрэт чалавека, маючы толькі яго шкілет, выкладзена Герасімавым у некалькіх важкіх тамах, якія маюць разлікі і табліцы. Гэтыя кнігі вытрымалі не адно выданне. Калі коратка пераказаць змест кніг Герасімава, дык асновы яго метаду зводзяцца да наступнага.

Паміж формай чэрапа і формай мяккіх тканін існуюць простыя і складаныя залежнасці (карэляцыі). Індывідуальныя асаблівасці будовы мышц твару абумоўлены канфігурацыяй чэрапа.

Шматгадовыя эксперыменты, прэпарыраванне трупаў у моргах памаглі вучонаму выявіць заканамернасці карэляцый. Па характару сцірання зубоў і іншых адзнаках ён устанаўлівае, ці меў чалавек прывычку трымаць рот поўадкрыты ці звычайна моцна сціскаў сківіцы; па ледзь прыкметных слядах валасяных цыбулін на цёмных касцях вызначае, ці не быў нябожчык лысы; па мікраструктуры касцей мяркуе аб тым, ці быў ён поўны або худы. На сукупнасці дэталей «архітэктуры твару» прафесар пазнае размяшчэнне і напрамак носагубных складаў, буйных зморшчын на ілбе, вакол вачэй.

### ПАЧАТАК ДАСЛЕДАВАННЯЎ — СІБІР

Упершыню праблему рэканструкцыі твару па чэрапу спрабавалі вырашыць у канцы XIX стагоддзя нямецкія вучоныя Вірхаў, Белькер, Шафенгаузен. Ім удавалася ствараць толькі расавыя, тыповыя партрэты. Такі шлях у маладосці прайшоў і Міхаіл Герасімаў, не ведаючы нават, што ў яго былі папярэднікі.

Пачатак яго пошукаў адносіцца да таго часу, калі ён, сын урача, дзевяцігадовы хлопчык, выпадкова знайшоў непадалёку ад свайго дома на ўскраіне Іркуцка ў Сібіры пахаванне, якое адносіцца да каменнага веку. Герасімаў захапіўся археалогіяй. Адначасова з заняткамі ў школе ён вывучаў анатомію, прэпарыраваў, спадзеючыся калі-небудзь у будучым аднавіць аблічча знойдзеных ім старажытных жыхароў. У 21 год ён адкрыў археалагічны помнік верхняга палеаліта — стаянку «Мальта» ў 60 кіламетрах на захад ад Іркуцка.

Тады ж ён стварыў першы гіпсавы партрэт аднаго чалавека, які вытрымаў кантрольную праверку. Параўнанне фатаграфіі, якую раней яму не паказвалі, і ўзноўленага ім па чэрапу твару не пакідалі сумненняў у правільнасці прыёмаў Герасімава.

Вучоны вярнуў з нябыцця адчувальныя вобразы соцень людзей, якія памерлі паміж эпохамі стрэл з каменнымі наканечнікамі і ядзернай зброі. Яму належаць скульптуры эміра Тамерлана (XIV стагоддзе), таджыкска-персідскага паэта Рудакі (IX—X стагоддзі), рускіх князёў, герояў вайны 1 г. д. Выйшаўшыя з яго лабараторыі партрэты ілюструюць падручнікі старажытнай гісторыі розных краін.

Аднойчы, хутка пасля заканчэння другой сусветнай вайны, у кватэру Міхаіла Герасімава пазванілі. Ён адчыніў дзверы і ўбачыў пажылых мужа і жонку.

— Урач Б., — адрэкамендаваўся мужчына. — Гэта мая жонка.

Яны расказалі прафесару, што ў 1941 годзе ў час абароны Масквы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінуў іх сын Аляксандр. Яны атрымалі дазвол раскрыць братнюю магілу і павезці да сябе, на мясцовыя могілкі, астанкі Аляксандра.

Але калі магіла была раскрыта, яны ўбачылі, што армейскі апазнавальны знак Аляксандра ляжыць паміж двума шкілетамі. Які шкілет іх сына? Ці не можа вучоны ўзнавіць партрэт па эксгумураваным чэрапе і тым самым рассеяць пакутлівыя сумненні бацькоў?

Расказ перапыняўся слязамі жанчыны, муж і жонка малілі памагчы ім і не разглашаць іх імёнаў.

Бацькі, зразумела, не паказвалі Герасімаву партрэт сына. Аднак, калі бюст быў гатовы, яны здзівіліся падабенствам скульптуры з памёршым. Нездаволены быў толькі сам аўтар работы. Ён прыдзірліва параўноўваў зроблены ім партрэт з прыжыццёвай фатаграфіяй Аляксандра і з горыччу адзначаў: не ўдалося ўгадаць юнацкую прыпухласць шчок, губ. Відаць, разлікі не такія ўжо дакладныя.

Але маці загінуўшага паведаміла Герасімаву, што ў яго ў руках не самая апошняя фатаграфія яе сына. «Перад адпраўкай Аляксандра на фронт, — сказала яна, — я бачыла яго іменна такім, які ён у вас, — схуднелым, больш дарослым».

### ДЗВЕ МАСКІ ШЫЛЕРА

У 1805 годзе Веймар развітваўся з Фрыдрыхам Шылерам. З твару вялікага паэта была знята пасмяротная маска.

Праз дваццаць адзін год астанкі Шылера перанеслі ў новую магілу. Яго труну з цяжкасцю знайшлі сярод сямі з лішнім дзесяткаў іншых трун, што запоўнілі да таго часу склеп.

Яшчэ праз 53 гады анатом Велькер выступіў з сенсацыйным паведамленнем, што з гарадскога склепа перанесены не Шылер, а нейкі невядомы. Гэта заява вучонага паслужыла прычынай для дыскусіі, якая працягвалася дзесяткі гадоў.

Каб вырашыць зацягненую спрэчку, два гады назад нямецкія вучоныя зрабілі паўторнае абследаванне астанкаў. У Веймар быў запрошан Міхаіл Герасімаў.

Прадстаяла выбраць адзін чэрап з двух знойдзеных. Аднаўленне твару па адным чэрапе паказала, што ён з'яўляецца жаночым. Другі ж чэрап, пасля таго, як Герасімаў нанёс на яго васкавыя «мяккія тканіны», даў скульптурную адліўку, ідэнтычную з пасмяротнай маскай. Праўда, сямтам форма галавы герасімаўскай і гіпсавай копіі разыходзілася. Аказалася, што майстар, здымаючы пасмяротную маску, завязаў валасы касынкаю. Вузел касынкі выразна адбіўся за правым вухам маскі. Потым майстар састругаў гэтыя сляды з гіпсавай адліўкі. Месцамі яго нож забраўся залішне глыбока.

Цяпер у кабінеце Герасімава вісіць гіпсавая паўмаска Шылера. Прафесар цэніць яе не толькі як вынік удалага навуковага эксперыменту, але і як памяць аб вялікім паэце.

### НЕ МАСТАЦТВА, А НАВУКА

— У аднаўленне твару па чэрапу ні ў якім разе не павінна ўмешвацца фантазія, — папярэджвае работнікаў сваёй лабараторыі Міхаіл Герасімаў. — Гэта—не мастацтва, гэта—навука.

Сябе ён не лічыць скульптарам-прафесіяналам. Адзіны маленькі бюст (дачкі Тацяны), зроблены ім, па яго словах, проста выпадкова атрымаўся падобным. Скульптару цяжка было б утрымацца ад унясення элементаў творчага домыслу ў скрупулёзную анатамічную пабудову на голых касцях.

Бюсты, створаныя Герасімавым, аднастайныя па павароту галавы. І толькі рускі князь XII стагоддзя Андрэй Багалюбскі ў адрозненне ад іншых паказаны з горда ўскінутым падбародкам. Аказваецца, у Багалюбскага шыйныя пазванкі былі зрэсшыся. Пры ўсім жаданні ён не мог бы схіліць галаву. І прафесар добрасумленна адлюстраваў тое, пра што яму расказалі маўклівыя чэрап і шкілет князя.

Ва ўсіх чатырох пакоях кватэры Міхаіла Герасімава на паліцах, сталах, нават на падаконніках стаяць бюсты. Жонка прафесара Тамара, якая працуе сакратаром у Акадэміі навук СССР, не пярэчыць супраць утаржэння старажытных славутасцей у свае ўладанні — яна падзяляе любоў свайго мужа да археалогіі і антрапалогіі.

Археалогія, антрапалогія і ўдасканаленне метадаў аднаўлення твару па чэрапу паглынаюць увесь час Міхаіла Герасімава. І толькі іншы раз, вельмі рэдка, ён бярэ ў рукі нож і кавалак дрэва, і ў яго на паліцах паяўляецца чарговая прыгожая фігурка жывёлы.

**Віктар КУРАНАЎ,**
**карэспандэнт агенцтва друку Навіны**

# ГАЛАСЫ МІНУЛАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

### ВЫДАДЗЕНА Ў ВІЦЕБСКУ

У пачатку нашага стагоддзя група энтузіястаў рашыла арганізаваць у Віцебску грамадскую чытальную залу. Сабраных у складчыну грошай аказалася недастаткова, і арганізацыйны камітэт прыняўся за падрыхтоўку спецыяльнага зборніка, увесь даход ад якога павінен быў пайсці на набыццё кніг. Гэты зборнік убачыў свет у Віцебску ў 1912 годзе пад назвай «З ваколіц Дзвіны». Вялікага фармату і добра ілюстраваная кніга, па сутнасці, з'яўлялася альманахам тых аўтараў, якія нарадзіліся або жылі на тэрыторыі Віцебскай губерні і пісалі на польскай мове. Але царскім уладам прыйшоўся не да спадобы свабодалюбівы тон многіх матэрыялаў зборніка, пасля выхаду яго пачаліся канфіскацыі, і таму ў наш час «З ваколіц Дзвіны»—бібліяграфічная рэдкасць. Адзін экземпляр кнігі захоўваецца ў Публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе.

Як бачна з прадмовы Яна Обста, ініцыятарам выдання зборніка быў віцебскі адвакат і грамадскі дзеяч Вацлаў Федаровіч. Ён памёр у 1911 г., так і не дачакаўшыся здзяйснення сваёй задумы. Станіслаў Лапацінскі ў некралогу, прысланым з далёкай Венецыі, піша, што Федаровіч нарадзіўся ў Магілёве, сваю службовую кар'еру пачаў у Ерэване. Але калі ў Арменіі пачалося ганенне «інародцаў», наш зямляк, не жадаючы ўдзельнічаць у ім, вярнуўся ў Беларусь. У пісьме да свайго сябра Федаровіч пісаў: «Не хачу быць у ліку тых, хто дзеля ордэна і кар'еры становіцца прыгнятальнікам народа». Віцебская кватэра Федаровіча ператварылася ў гістарычны музей, стала месцам збораў мясцовай інтэлігенцыі, а гаспадар кватэры, аўтар прац аб мінулым Аршанскага павета і становішчы беларускіх сялян, выбіраецца членам Кракаўскай акадэміі навук. Аб дэмакратызме Федаровіча сведчыць і тое, што ён адмовіўся ад прапаноў выставіць сваю кандыдатуру пры выбарах у царскую Думу.

Большасць матэрыялаў зборніка «З ваколіц Дзвіны» прысвечана мінуламу беларускага народа, яго побыту і літаратуры. Тут змешчаны пераклады вершаў Янкі Купалы «З песень аб нашай зямлі» і «А хто там ідзе?» (у першым з іх цэнзурай выкрэслены апошнія тры радкі). У перакладзе аўтара, які схаваўся за крыптанімам «м. в. с.», публікуецца верш Янкі Лучыны «Сваёй зямлі».

Многа цікавых звестак пра Яна Баршчэўскага прыводзіцца ў публікацыі нейкага Віт. Ф. Ён цытуе пісьмы Баршчэўскага, прыводзіць яго верш «Апоўначы з ляпончыкамі», прасякнуты верай у перамогу сіл прагрэсу і розуму. Па сцвярджэнню Віт. Ф., рукапісы гэтага аднаго з першых беларускіх пісьменнікаў часткова знаходзіліся ў паперах В. Федаровіча, часткова—у сямейным архіве графаў Ржэвускіх (на жаль, абодва гэтыя зборы не трапілі ў дзяржаўныя кнігасховішчы СССР і, магчыма, застаюцца ў прыватных руках).

Сярод літаратурных матэрыялаў зборніка вылучаюцца вершы Станіслава Гласкі, Яна Обста і Эдварда Слонскага. Апошні ў вершы «Я ведаю гэтую старонку» звяртаецца з усхваляваным маналогам да сівой Дзвіны і «бацькі рэк старога Нёмана». Успаміны С. Уляноўскай «Гісторыя дзевяці з паловай душ» прысвечаны прыгонніцкай мінуўшчыне, калі сялян прайгравалі ў карты, разлучалі з сем'ямі, а дзяцей лічылі за палову душы. Пісьменніца са шчырым спачуваннем расказала пра трагедыю беларускай сялянкі Ганулі і яе сына. Успамінам Уляноўскай сугучныя дарожныя нататкі А. Асандоўскага. Будучы ў Кітаі, ён бачыў, як англічане распраўляюцца з кітайскімі кулі, забіваюць тых, хто ўзнімае голас пратэсту. Станіслаў Гласка, урач рускага карабля, прыгадвае портартурскія падзеі 1904 г. і вядомае землетрасенне ў Месіне, а Юзаф Гласка—падарожжа ў Познань і Прагу.

Побач з белетрыстыкай у зборніку «З ваколіц Дзвіны» багата навуковых даследаванняў і публікацый, прысвечаных гісторыі Беларусі, яе эканоміцы і грамадскаму жыццю. Праф. І. Петражыцкі разглядае юрыдычнае становішча жанчын, А. Асандоўскі—развіццё медыцынскага абслугоўвання на Віцебшчыне. Публікуюцца дзённікі вядомага выдаўца «Рубона» Казіміра Буйніцкага аб паўстанні 1863 г. і полацкага маршалка Ірэнія Васілеўскага аб падзеях 1812 г. у Беларусі. Ураджэнец Віцебшчыны, аўтар вядомай кнігі «Якім шляхам я дайшоў да сацыялізма?» Баляслаў Ліманоўскі даслаў у зборнік урывак са сваёй працы пра С. Ворцэля. Большасць аўтараў зборніка стаіць на навуковых пазіцыях, прызнаючы за беларускім народам права на незалежнасць і называючы Віцебшчыну і Полаччыну «карэннай Беларуссю». Аднак у некаторых матэрыялах трапляюцца і рэакцыйныя сцвярджэнні.

Аматары мастацтва знойдуць у зборніку рэпрадукцыі з прац беларускіх мастакоў і скульптараў. Асабліва ўражвае скульптура «Голад», выкананая настаўнікам малявання Віцебскай гандлёвай школы Канстанцінам Жмігродскім. У аддзеле нот змешчана «Лявоніха» з аперэты Юзафа Шадурскага «Тарас на Парнасе». Музыказнаўцам варта было б устанавіць, які лёс напаткаў рукапіс гэтай аперэты і яе аўтара, аднаго з першых беларускіх кампазітараў.

Кніга «З ваколіц Дзвіны» наводзіць на роздум яшчэ з адным плане. Ян Обст піша ў прадмове, што В. Федаровічу належалі багатыя зборы карцін, кніг, старадаўняй зброі. Што з імі сталася пасля смерці ўладальніка? Відаць, высвятленнем лёсу багатых калекцый В. Федаровіча павінны заняцца краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў. Ды і ці толькі гэтых калекцый?! У сваіх нататках «Падарожжа па Палессі і беларускаму краю» П. Шпілеўскі пісаў у 1858 г., што ў зборах графаў Тышкевічаў у Лагойску ёсць 200 карцін італьянскіх майстроў, калекцыя этрускай керамікі, 200 медных гравіравальных блях, шпага Пятра І. Што сталася з імі? У 1908 г. Напалеон Роўба, сябра Ф. Багушэвіча, выдаў у Вільні «Даведнік аб Літве і Беларусі». Там прыгадваецца багатая бібліятэка А. Ельскага ў Замосці, архіў Скірмунтаў у Пінску, галерэя карцін і гравюр у Станькаве... Мне здаецца, што патрэбна больш энергічна весці пошукі гэтых і іншых мастацкіх скарбаў, якія створаны народнымі рукамі і павінны належаць народу. А калі няўмольны час і войны знішчылі іх—прынамсі хоць гэта трэба ўстанавіць з дапамогай сведкаў, якіх з кожным годам становіцца ўсё менш і менш.

### ЗАБЫТАЯ АПОВЕСЦЬ П. ШПІЛЕЎСКАГА

Да апошняга часу П. Шпілеўскі быў вядомы пераважна як аўтар прац, прысвечаных беларускай этнаграфіі і фальклору, дарожных нарысаў і двухактовай п'есы «Дажынкі». Аднак спадчына гэтага пісьменніка яшчэ недастаткова даследавана. Аказваецца, П. Шпілеўскі пісаў таксама творы для дзяцей. Яго аповесць «Цыганёнак» была выдадзена ў Пецярбургу ў 1855 годзе.

Грунтуючыся на ўспамінах дзяцінства, якое прайшло на беларускай зямлі, П. Шпілеўскі расказаў сентыментальную гісторыю кемлівага цыганскага падлетка Марціна, якому надакучыла вандраваць з табарам і паказваць розныя цыркавыя трукі. Марцін пасябраваў з панічом і застаўся жыць у яго доме. Новы сябра навучыў цыганёнка чытаць, пазнаёміў з маральна-этычнымі нормамі. Дружба хлопчыкаў была настолькі моцная, што калі паніч паехаў у горад вучыцца, Марцін уцёк у лес, захварэў ад прастуды і памёр.

«Цыганёнак» Шпілеўскага не мог не прываблiць тагачасных юных чытачоў. Аповесць напісана займальна, выхоўвае гуманістычныя пачуцці. Аўтар сцвярджае, што ўсе людзі роўныя, што ў кожным чалавеку закладзены добрыя асновы і задача адукаванага чалавека—дапамагчы ў іх развіцці. Побач з гэтым аповесць грашыць празмернай меладраматычнасцю, спрошчаным дыдактызмам. Пачуцці герояў, іх слязлівасць празмерна гіпербалізаваны.

Побач з кнігамі на польскай мове «Паэтычныя забаўкі моладзі мінскіх школ» Міхала Дудзінскага (Вільня, 1782) і «Чытанка для ўцехі малых дзетак» Мікалая Лойкі (Мінск, 1860; у 1864 г. забаронена цэнзурай) «Цыганёнак» Шпілеўскага папярэднічаў нараджэнню беларускай дзіцячай літаратуры.

У Гродна адкрыта трэцяя выстаўка мастацкай фатаграфіі «Гродзеншчына сёння». Больш ста работ 25 аўтараў расказваюць пра дасягненні працоўных вобласці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, паказваюць перадавых людзей прынёманскага краю, яго цудоўную прыроду.

На выстаўцы пабывала ўжо больш дзесяці тысяч чалавек.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

## ГОСЦІ З АФРЫКІ

Учора ўвечары ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі пачаліся гастролі ансамбля танца Гвінейскай Рэспублікі. Кіруе ім Соха Мамадзі Махамед. Складаецца ансамбль з маладых выканаўцаў. У яго праграме — танцы і песні народаў Афрыкі.

Цікавы танец «Феракароба» выконвалі раней толькі маладыя мужчыны, паказваючы на плошчы пры святле месяца свой спрыт перад нявестамі. Цяпер у танцы ўдзельнічаюць і дзяўчаты.

Танец «Хто вызваліў нас» расказвае аб барацьбе гвінейскага народа за сваю незалежнасць.

З цікавасцю глядзяцца і іншыя танцы нашых гасцей.

У Гвінеі існавалі выканаўцы — адначасова музыканты, спевакі і танцоры. У часы каланіялізму яны вандравалі па вёсках у пошуках заробку. Цяпер гэтыя артысты, аб'яднаныя ў брыгады, перадаюць сваё майстэрства маладому пакаленню.

Яркае і самабытнае мастацтва маладых афрыканскіх артыстаў.

## КУЛЬТУРНЫЯ НАВІНЫ З ГДР

### РАСТОЦКАЯ ПРЭМ'ЕРА

«Народны тэатр» у Растоку паказаў прэм'еру — драматычную паэму лаўрэата Нацыянальнай прэміі ГДР Кубы (Курта Бартэля) «Тэра інкогніта». Інсцэніроўку спектакля ажыццявіў дырэктар тэатра Ганс Анзельм Пертэн.

У п'есе расказваецца пра пошукі нафты на поўначы рэспублікі—у Мекленбургу. «Чорнае золата» шукаюць тут нямецкія і савецкія бурыльшчыкі. Пра іх цяжкую, але ганаровую працу апавядае п'еса.

Па аднадушнай думцы тэатральных крытыкаў, «Тэра інкогніта» з'явілася буйнай культурнай падзеяй у жыцці рэспублікі. Як пісала газета «Нейес Дэйчланд», драматычная паэма Кубы прасякнута рэвалюцыйным пафасам. «Сіла і паэзія, гумар, жыццёвая мудрасць і глыбокае веданне справы,—падкрэслівала газета, — ператварылі спектакль у хвалюючую тэатральную падзею».

Новая работа Кубы будзе экранізавана на студыі ДЭФА.

### У ВЫДАВЕЦТВЕ «ФОЛЬК УНД ВЕЛЬТ»

З творамі класікаў і сучасных аўтараў зарубежных краін шырока знаёміць нямецкіх чытачоў берлінскае выдавецтва «Фольк унд Вельт» («Народ і мір»). У бліжэйшы час у выдавецтве выйдуць тры кнігі савецкіх аўтараў: «Вяршыні жыцця» Галіны Серабраковай, «Праўда і крыўда» Міхаіла Стэльмаха, а таксама зборнік, у якім будуць змешчаны апавяданні чатырнаццаці маладых савецкіх празаікаў.

### ПА МАТЫВАХ «ЗІМНЯЯ БІТВЫ»

Кампазітар ГДР Курт Форэст піша оперу па п'есе Іяганеса Бехера «Зімняя бітва». Прэм'ера оперы, якая будзе называцца «Страсць Іяганеса Хергера», адбудзецца ў Штральзундзе. Лібрэта напісана самім кампазітарам.

Форэст набыў вялікую вядомасць за апошнія гады перш за ўсё сваімі трыма операмі, напісанымі па драмах Фрыдрыха Вольфа ( у прыватнасці, «Бедны Конрад»), а таксама музыкай да 20 дакументальных фільмаў студыі ДЭФА.

### ДАТА НАРАДЖЭННЯ: 1664 ГОД

Жыхары акруговага цэнтра ГДР — Магдэбурга адзначылі 300-годдзе газетнай справы ў сваім горадзе. У 1664 годзе паштмайстар гарадскога савета атрымаў права на выданне штотыднёвай газеты. Тады ў горадзе жыло пяць тысяч чалавек.

Сёння ў Магдэбургу — прамысловым і культурным цэнтры рэспублікі — выдаюцца чатыры штодзённыя газеты і адзін штотыднёвік. У ГДР цяпер выходзяць 42 газеты і 625 часопісаў.

**К. САВІН.**
(ТАСС).

## ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

*Факты з зарубежных газет і часопісаў*

Аддзел вядзе загадчык кафедры замежных моў Віцебскага медыцынскага інстытута **Л. АБРАМЕНКА.**

### ЛЮЛЬКІ ДА ВЫБАРАЎ

У сувязі з пашырэннем моды на жаночыя люльні для курэння і будучымі прэзідэнцкімі выбарамі гандлёвая фірма Нейман-Маркус у горадзе Далас (штат Тэхас) выпусціла ў продаж серыю люлек для жанчын. Люльні маюць форму галавы сенатара Галдуотэра. Для багатых дам люльні робяцца з чыстага золата і ўпрыгожваюцца каштоўнымі камянямі ад паўтары тысячы долараў і больш.

«Вохенпост».

### ХАПАЕ СВАІХ

Англійскія таможныя ўлады за апошні час канфіскавалі і спалілі 826.454 кнігі парнаграфічнага зместу і 328.464 часопісы, што прыбылі сюды з Амерыкі, заявіў карэспандэнтам адзін з высокапастаўленых чыноўнікаў таможні. Краіна і без таго літаральна наводнена парнаграфічнымі выданнямі і ўвоз амерыканскіх непажаданы.

«Ліберасьён».

### ЭКСПЕРТЫ ВЫВУЧАЮЦЬ ПЫТАННЕ

Заходнегерманскі парламент нядаўна абмяркоўваў пытанне аб увядзенні падаходнага падатку для прастытутак і куртызанак, таму што многія з гэтых асоб маюць вельмі вялікія даходы, не абкладзеныя падаткам. Было прапанавана стварыць камісію экспертаў для грунтоўнага вывучэння гэтага пытання.

«Вохенпост».

### СУСТРЭЧА АПЕКУНА

Адміністрацыя Эдзінбургскага універсітэта звярнулася нядаўна да студэнтаў з заклікам «паводзіць сябе як дарослыя і не ствараць беспарадкаў» у час будучага візіту прынца Філіпа, які лічыцца апекуном Эдзінбургскага універсітэта. Апошні раз прынц Філіп наведаў універсітэт у 1958 годзе і быў тады літаральна засыпаны тухлымі яйкамі і гнілымі памідорамі.

«Фольксштыме».

### СІМФОНІЯ Ў ЧАТЫРОХ ДЗЕЯХ

Карл-Эрык Вэлін, які называе сябе «піяністам канкрэтных дзеянняў», выступіў нядаўна з канцэртам у Стакгольме. Слухачам была прапанавана сімфонія ў чатырох дзеях. Дзея першая: піяніст, апрануты ў белы касцюм, кідаецца да піяніна з малатком і зубілам у руках, хутка прабівае дзірку ў піяніна і закладвае туды зарад узрыўчаткі. Дзея другая: выбух. Дзея трэцяя: музыкант спрабуе скрышыць тое, што ўцалела ад выбуху, потым пачынае распранацца. Дзея чацвёртая: з дапамогаю электрычнай пілы піяніст у адных кальсонах пілуе рэшткі піяніна на дробныя кавалкі. Пры гэтым ён калечыць сабе нагу, і хуткая дапамога адвозіць яго ў бальніцу.

«Ліберасьён».

### ГРОШЫ ЗА КРЫК

Адзін з пацыентаў нью-йоркскага зубного ўрача Морцімера Роулэнда ўзбудзіў судовую справу супраць урача. Пацыент патрабуе, каб урач заплаціў яму за крык, запісаны на плёнку. У ходзе судовага разбірання высветлілася, што зубны ўрач вырываў зубы ў небагатых кліентаў такім чынам, што пацыенты надрываліся ад крыку. Устаноўлены побач магнітафон запісваў гэтыя гукі, і плёнка з запісам потым прадавалася галівудскім кінастудыям. Гэтыя запісы манціраваліся ў фільмы, у якіх па ходу дзеяння ахвяру забіваюць ці катуюць.

«Вохенпост».

## ТЭЛЕБАЧАННЕ

### 7 жніўня

**Першая праграма.** 17.15 — праграма перадач. 17.20 — для школьнікаў і малодшых школьнікаў. «Аб чым расказаў тэлескоп» (М). 17.50 — «Тая, што дае жыццё». Кінанарыс. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Дзеянні атрада грамадзянскай абароны сельскага раёна». Навучальны фільм. 19.00— А. Сафронаў. «Судьба — индейка». Тэатральны спектакль (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21.40 — для веруючых і няверуючых. «Цудатворац з Бірулёва». Кінанарыс. 22.00 — канцэрт па заяўках.

**Другая праграма.** 17.50 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00 — «На галоўным напрамку». Тэлевізійны фільм Ленінградскай студыі тэлебачання (М). 19.00 «Дуэнья». Тэлевізійны спектакль. 21.40 — «Фестываль песні». Перадача з Варшавы.

### 8 жніўня

**Першая праграма.** 16.05 — праграма перадач. 16.10 — «Піянерскі касцёр». Тэлевізійны часопіс. Трансляцыя на Маскву. 17.00 — на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Першынство СССР па футболу. «Тарпеда» (М) — «Шахцёр» (Данецк) (М). 18.50 — «Навіны з блакітнага экрана». 19.40 — «З днём нараджэння!». Перадача, прысвечаная 20-годдзю Мінскага аўтазавода. 20.20 — мастацкі фільм «Вялікі фіцыль» (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «На агеньчык». Перадача з Ленінграда.

**Другая праграма.** 17.00 — «Артыст з Коханаўкі». Мастацкі фільм. 18.10 — «Каненкаў». Тэлевізійны рэпартаж. 18.50 — тэлевізійныя навіны (М). 19.00 — «Па вялікай рускай рацэ» (М). 19.30—канцэрт. Перадача з Ленінграда. 20.20 — «З днём нараджэння!». Перадача, прысвечаная 20-годдзю Мінскага аўтазавода.

### 9 жніўня

**Першая праграма.** 10.55 — праграма перадач. 11.00 — для школьнікаў. «Увага, на старт!». Перадача з Варшавы. 12.00 — Куды пайсці вучыцца (М). 12.15 — мастацкі фільм «Дзяўчынка, з якой я сябраваў». 16.55 — праграма перадач. 17.00 — «Служаць хлопцы ў Беларусі». Трансляцыя на Вільнюс. Расказ аб воінах-літоўцах, якія служаць у войсках ВВА. 18.00 — «Горад сямі стагоддзяў». Кінанарыс. 18.20 — «Сёння — дзень будаўніка». 19.20 — «Жывапіс Святаслава Рэрыха». Кінанарыс. 19.30 — «Боская камедыя». Спектакль Цэнтральнага тэатра лялек пад кіраўніцтвам С. Абразцова. Трансляцыя з Вільнюса. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — канцэрт па заяўках будаўнікоў (М).

**Другая праграма.** 15.30 — для дзяцей. «Бобік і Барбос». Тэлевізійная пастаноўка (М). 16.00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Баявая садружнасць» (М). 16.30 — музычны кіёск (М). 16.50 — «Будоўлі сямігодкі — ударны фронт» (М). 17.40 — «Навасёлы». Дакументальны фільм (М). 18.30 — кінапанарама. Перадача з Ленінграда. 19.55 — «Прыходзьце заўтра». Мастацкі фільм (М).

### 10 жніўня

**Першая праграма.** 17.25 — праграма перадач. 17.30—для школьнікаў. «Твой замежны равеснік». Юнацтва Японіі (М). 18.00—мультфільм. 18.10 — «Добры настрой». Аб новых формах гандлю ў Маскве (М). 18.35 — тэлевізійныя навіны. 19.00 — першынство СССР па футболу. СКА (Растоў) — «Дынама» (М). 19.45 — «Па слядах герояў». Выступленне пісьменніка Н. Імшанецкага (г. Фрунзе) аб героях-беларусах, якія жывуць у Кіргізіі. 20.10 — Д. Зігманта. «Будзь стойкай, Юта!» Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 21.30— тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — канцэрт «Бярозкі». 22.30 — кінанарыс. 22.50 — «Галы, ачкі, секунды». Спорт за тыдзень (М).

**Другая праграма.** 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Добры настрой». Аб новых формах гандлю ў Маскве (М). 18.35 — «Жыццё, аддадзенае барацьбе». (М). 19.00 — кінапраграма. 19.45— «Белы званочак». Кінанавела (М). 20.10 — кінапраграма. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — наш прэс-цэнтр. «Пісьменнік і час» (М). 22.50 — галы, ачкі, секунды. Спорт за тыдзень. (М).

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШК